Супрасльскі манастыр ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Сяргей Новік—Пяюн ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2624) Год LI | Беласток, 27 жніўня 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Спасаўскія запусты

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Дзеці з Беларусі і Бельска ў беларускіх народных строях паказвалі фрагменты жніўных абрадаў

Калі на сцэне амфітэатра ў Бельску-Падляшскім святкаваліся „Спасаўскія запусты", пры дарозе з Беластока на большасці палёў збожжа было складзена ў „бочкі", кубікі і традыцыйныя снапы.

У ваколіцах Рыбал у полудзень таго дня, незалежна ад таго, што была нядзеля, старэйшы мужчына махаў касою. Можа, баяўся чарговай навальніцы, пасля тае, што прайшла над палямі ўчора. А ў Бельску ўжо паўгадзіны да пачатку выступленняў у амфітэатры з'явіліся тлумы. Пасля не хапіла сядзячых месцаў. Сярод гледачоў перад сцэнай прахаджваўся і здымаў маладых і старэйшых артыстаў адзін пажылы немец:

— Гэта захапляючае, — падзяліўся з „Нівай" уражаннямі на ламанай пальшчызне.

Яшчэ да пачатку сёлетніх Запустаў за кулісамі сцэны завіхалася Альжбета Фіёнік з Бельскага дома культуры, які быў суарганізатарам мерапрыемства. Усхвалявана рыхтавала дзяцей з групы „Антракт", якая разам з калектывам „Зазуленька" з Меднага Брэсцкай вобласці пад апекай Яўгеніі Бараноўскай, рыхтавалася да інаўгурацыйнага выступлення. Маладыя людзі з гэтага і другога боку мяжы паказалі тэатралізаваныя сцэнкі і абрадныя спевы з Падляшша і Палесся. Раней аднак гэту пленэрную імпрэзу-свята афіцыйна адкрыў яе галоўны арганізатар ад павятовага аддзела Беларускага грамадска-культурнага таварыства Андрэй Сцепанюк, на штодзень дырэктар бельскага Комплексу школ з беларускай мовай.

— „Спасаўскія запусты" ўвайшлі ўжо ў традыцыю нашага горада. Гэта такое адсвяткоўванне перад галоўным святам — святам Спаса.

У размове з „Нівай" тлумачыў:

— Мы сарганізавалі „Спасаўскія запусты" ўжо дванаццаты раз. Хочам паказаць, што ў Бельску такія мерапрыемствы патрэбныя. Выдумалі мы іх пры нагодзе свята Спаса для людзей, якіх штогод прыходзіць сюды мноства. Сёлета гэты фэст падрыхтавалі не толькі ў Бельску, але і ў Крывятычах. Дарэчы, у мінулых гадах таксама мы ездзілі ў розныя гміны. Фэст заўжды пачынаем мастацкай

Прасілася жытка ў дзявочак:
— Сажнеце мяне ў снапочак
Занясеце мяне ў клуньку,
Палажыце мяне ў старонку —
Няхай у клуньцы пагашчу,
Пакуль на поле зноў пайду.
У мяне ў клуньцы гасціна,
А на полі — радзіна,
Бо мяне ў клуньцы цапамі б'юць,
А на полі дажджы льюць.

часткай, дзе стараемся паказаць тое, што разнародныя традыцыі і абрады жывуць яшчэ ў народзе.

„Спасаўскія запусты" выраслі з ідэі і ад пачатку былі арганізаваны павятовым аддзелам БГКТ, без сягання па дапамогу да Галоўнага праўлення Таварыства:

— З ГП БГКТ ніякіх грошай мы на гэту імпрэзу не атрымлівалі. Самі знаходзім спонсараў, грошы дае таксама староства і Бельская гміна. І, як аказваецца, можна арганізаваць хоць бы такія фэсты без дзяржаўных грошай. На пачатку ўключаліся яшчэ іншыя беларускія арганізацыі. Кажам, што мерапрыемства робіць беларуская грамада з Бельска. Не стараемся тут дзяліцца на арганізацыі. Ёсць група людзей, якая хоча штосьці зрабіць для бяльшчан.

Фон у глыбі сцэны, на якой выступалі апрача фальклорных таксама чыста эстрадныя калектывы, быў аздоблены вырэзанымі з кардону яблыкамі, каласамі, драўляным колам, скрыпкай, гармонікам, стылізаванай беларускай спадніцай. Перад эстрадай стаялі кашы з рознакаляровымі штучнымі кветкамі.

У першай — чыста абрадавай частцы — дзятва з Беларусі і Бельска пры дапамозе рэквізітаў (сярпоў, вянкоў, снапкоў і г.д.), у беларускіх народных строях паказвалі фрагменты абрадаў і песень спадарожнічаючых жніву. Гэтая праграма была раней падрыхтавана на супольных занятках пры Бельскім доме культуры, а раней прадстаўлялася м.інш. у Музеі малой айчыны ў Студзіводах. З хваляваннем прымаліся таксама тры бельскія дзіцяча-маладзёжныя калектывы, м.інш. „Світанак" і „Капрыс". Старэйшыя глядачкі, з якімі мы размаўлялі, чакалі асабліва калектываў больш вядомых і дасведчаных, якія выступілі ў другой частцы канцэрта.

— Такое свята вельмі патрэбнае. У Бельску не маем іх зашмат. Куды тут пойдзеш? А так хоць маем штосьці. Можна хоць крыху развеяцца, — прызналася адна з іх.

— Я на Запусты прыходжу заўсёды, — запэўнівала другая.

— Цяпер дык і ў Студзіводах я была. Таксама было файна. Адно шкада, што тады дождж ішоў.

Раіна СТЭФАНЧУК

На ўкус і цвет... ☞ 2

Мікола ВАЎРАНЮК

— Што ты, к..., на сябе надзеў? — не стрымалася знаёмая, убачыўшы на Сяброўскай бяседзе Юрку Астапчука зблізу. Лідэр славутых „Прымакоў" і заадно дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Гарадку паглядзеў з замілаваннем на свой сіне-белы халат, фантазійна ўзорыстую кашулю, упушчаныя ў боты шаравары. Адказаў не без гонару: — Як што? Вопратку рускага князя!...

Памяці беларускай змагаркі ☞ 2

Віктар ЛАДЗІЧ

У раённым цэнтры Зэльвы, дванаццатага жніўня а дванаццатай гадзіне, ля мясцовай царквы, па ўжо склаўшайся дванаццацігадовай традыцыі сабраліся людзі, каб ушанаваць памяць 96-х угодкаў з дня нараджэння і нязломны ваярскі дух адной з самых вялікіх дачок Беларусі, вязня сталінскіх лагераў, паэткі, змагаркі за беларускую незалежнасць і проста шчырай добразычлівай жанчыны, Ларысы Геніюш, якая...

Дзікі і людзі ☞ 8

Міра ЛУКША

У бок вялікага дома на падвойным падворку хуценька, апіраючыся на палачцы, павядзе мяне, не аглядаючыся, бубуля Надзя Тарасэвіч, а я за ёй подбежкам накіроўваюся на канец Случанкі. Я праз гэтую вёску найчасцей мільгом праязджала, а варта было б мне і раней заехаць сюды, бо тут мае хату Міра Лукша...

„Культура" ў культуры ☞ 11

Людміла КАРПЮК

Пакуль жывеш на сваёй зямлі, не ўяўляеш, як дорага і блізка табе ўсё, што існуе вакол цябе. Мы прызвычаіліся ганіць тое што ў нас ёсць і хваліць тое, чаго ў нас няма, але ёсць недзе там, у землях абетаваных. Як быццам усё так было, так ёсць і так павінна быць заўсёды і безумоўна...

9 770546 196000

На ўкус і цвет...

— Што ты, к..., на сябе надзеў? — не стрымалася знаёмая, убачыўшы на Сяброўскай бяседзе Юрку Астапчука зблізу. Лідэр славутых „Прымакоў" і заадно дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Гарадку паглядзеў з замілаваннем на свой сіне-белы халат, фантазійна ўзорыстую кашулю, упушчаныя ў боты шаравары. Адказаў не без гонару:

— Як што? Вопратку рускага князя!

Залатыя і срэбныя ніткі зайгралі ў заходзячым сонцы, бляску лямп са сцэны і двух вогнішчаў перад сцэнай, на якіх пякліся ці то кабанчыкі, ці баранчыкі. Знаёмую, якая больш за чвэрць стагоддзя перарабіла ў культуры, аднак, штучнае багацце не збіла з ног.

— Не п...і! — востра перасекла залатую ніць, што спалучала зорку эстрады з надуманай гісторыяй.

Гаспадар бяседы больш нагадваў туркменбашу ці хана, чымсьці князя. На сваё апраўданне мог бы сказаць, што дараванаму каню ў зубы не заглядаюць. Як і не круцяць носам на густы заказчыкаў касцюмаў. А яны — прадстаўнікі сённяшняга мінскага башы — пачуваюцца да спадчыны краіны, якая калісьці ганарыста расселася на шостай частцы зямной сушы і творча карыстаюцца нажыткам усяго савецкага народа, ад Брэсцкай крэпасці па Уладзівасток. Эстэтычныя густы гадавалі на псеўданародных арнаментах, якія па кавалку аблупліваюцца з гарадскіх небачосаў. Вяршыняй сцэнічнага мастацтва лічаць Славянскі базар у Віцебску. Паводле Беларускага тэлебачання: ці не найлепшы і найбольш вядомы фестываль у Еўропе (*sic!*).

Узгадаваныя на такой эстэтыцы дзіву даемся, чаму ж гэта Анжаліка Агурбаш ці іншая ўсходняя Ізаўра не заваявала астатніх пяці шасцін Зямлі. І не знаходзім ніякага іншага тлумачэння, як падкопы непрыхільных нам зайздроснікаў. Немцаў, амерыканцаў, яўрэяў... Адвечных ворагаў Славяншчыны!

Калі яны там такія, то хай душацца ў сваіх Вашынгтонах, Лонданах ці Парыжах! А мы будзем гуляць на нашых базарах, святочных пляцоўках і фэстах на прыродзе. Артыстаў апранем як мага прыгажэй. Паводле нашага густу. Размалюем іхнія кашулі ў каляровыя зігзагі. Вельмі прыгожа яны глядзяцца з джынсамі і чорнымі лакіраванымі туфлямі. Асабліва жаночымі — на высокіх абцасах. Проста вачэй не можна адарваць. Зрок так і едзе з вяночка на галаве на румяныя шчокі, чырвоныя каралі, казачны ўзор на кофце, паласаты саян, які туга напяўся на клубах, калготкі-кабарэткі і абцасы-шпількі, прыгодныя асабліва на пленэрных імпрэзах, калі маладзіцы як капіцы пракопваюцца да сцэны праз сыпкі пясок. *Noblesse oblige*. Элегантным трэба быць усюды і заўсёды!

Мы на сцэне не толькі хораша апранаемся, але і прыгожыя песні спяваем. Пра Яся, які ехаў на кані і Галю, якую прывязалі да сасны касамі, пра прымакоў, што ходзяць-бродзяць ля ракі і смэрэку, што расце далэко, пра тое, як у садзе гулялі, кветкі збіралі і пілі чарку на пасашок. Робім гэта не абы-як, кожны на свой капыл. А паводле стандартаў, вызначаных Беларускім радыё і адукаванымі інструктарамі, якія ўмеюць перарабіць старажытны напеў на лёгкі, зразумелы ўсімі матыў: умпа-умпа. Да песні — хай яна нават пра няшчасную Галю, якую, разам з сасной, падпалілі — абавязкова трэба даклеіць усмешку. І прытупваць, выкручвацца, ці каму гадоў дваццаць, ці семдзесят. Пасуе „Васілёчкам" і „Зорцы".

Як прыклад такога універсальнага сцэнічнага мастацтва можа служыць гурт „Палешукі" з Іванава — госця апошніх Музычных дыялогаў над Бугам у Мельніку. Спявалі добра вядомыя па ўсёй дзесяцімільённай рэспубліцы хіты. Паднялі да танца таксама польскую публіку. А прытым на обшчэпанятнай мове расказвалі пра цудоўную палескую прыроду, якая натхняе на творчасць старых і малых жыхароў гэтай краіны. Яны — носьбіты песеннай традыцыі Палесся. Эстафету панясуць далей наступныя пакаленні.

* * *

— Папса ёсць папса на кожнай мове, — кажа мой сын. — І нават, калі яна па-беларуску, слухаць яе не буду!

Яму, аднак, усяго чатырнаццаць гадоў. Не ведае, што гаворыць. Ані таго, чаго давядзецца наслухацца ў жыцці.

Мікола ВАЎРАНЮК

Памяці змагаркі

У раённым цэнтры Зэльвы, дванаццатага жніўня а дванаццатай гадзіне, ля мясцовай царквы, па ўжо склаўшайся дванаццацігадовай традыцыі сабраліся людзі, каб ушанаваць памяць 96-х угодкаў з дня нараджэння і нязломны ваярскі дух адной з самых вялікіх дачок Беларусі, вязня сталінскіх лагераў, паэткі, змагаркі за беларускую незалежнасць і проста шчырай добразычлівай жанчыны, Ларысы Геніюш.

Яе жыццё, творчасць, змаганне і стойкасць па сённяшні дзень з'яўляецца прыкладам для беларускіх патрыётаў. Ларыса Геніюш ніколі не здраджвала сваім перакананням, ніколі не ішла на кампраміс са сваім сумленнем. Перанёсшы ліхалецці вайны, уласныя праблемы, сум эміграцыі, жахі савецкай турмы, катаванні і допыты, яна ўсё адно засталася добрай і ветлівай. Да яе ўвесь час цягнуліся людзі. І суседзі, каб проста пагаварыць ці параіцца пра што-небудзь, хоць ведалі, што КДБ адсочвае кожнага, хто мае кантакты з паэткай, і творцы, паэты, пісьменнікі, навукоўцы, хоць выдатна разумелі, што гэта можа нашкодзіць іх кар'еры. Але кожны яе сучаснік, які хоць трохі быў заангажаваны ў беларушчыну, лічыў за гонар наведаць спадарыню Геніюш, якая да самай смерці не пагадзілася прыняць савецкага грамадзянства і была прыкладам нязломнай душы.

Пасля таго, як паэтка на стала вярнулася жыць у Зэльву, адмыслова для таго, каб сачыць за ёй і тымі, хто да яе наведваецца, быў створаны штат КДБэшнікаў. Але мужны дух беларускай патрыёткі быў мацнейшы за бесчалавечны адміністратыўны рэсурс савецкай машыны. І калі спадарыня Ларыса Геніюш пакінула гэты свет, на яе паховіны выйшлі ўсе жыхары раённага цэнтра і многа прыехаўшых, якія даведаліся пра гэтую трагедыю. І нават задоўга пасля смерці паэткі людзі працягвалі прыязджаць і прыязджаюць далей на яе магілу, што ўжо стала традыцыяй.

На жаль, сённяшнія адносіны ўладаў да постаці вялікай змагаркі засталіся савецкімі. Гэткімі ж, як і да ўсяго, у што яна верыла і за што змагалася. Яе прозвішча не сустракаецца ў сённяшніх школьных падручніках, яе біяграфія і творчасць замоўчваюцца. Але людзі памятаюць сваю гераіню і прыязджаюць, каб аддаць даніну памяці чалавеку, якога, без перабольшвання, можна ўнесці ў спіс пад загалоўкам „Сумленне нацыі".

У гэтым годзе, як і ў мінулым, у дзень памяці Ларысы Геніюш цэлы дзень ліў дождж. Гэта не перашкодзіла мясцовым актывістам і прыезджым патрыётам наведаць царкву, на тэрыторыі якой стаіць

помнік Ларысе Геніюш, і могілкі, дзе яна пахавана разам са сваім мужам Янкам, які таксама пакінуў свой гераічны след у змаганні за беларускую незалежнасць. Прысутныя маладыя патрыёты ўзнялі любыя сэрцу паэткі бел-чырвона-белыя сцягі, пра якія тая так марыла, каб луналі яны над яе магілай, і так прайшлі праз Зэльву аж да могілак. Там, на беларускай мове адбыўся малебен, які арганізаваў прыехаўшы адмыслова для гэтага з Жыровічаў, блаславёны на гэтую падзею архімандрытам, праваслаўны святар айцец Мікалай. Пасля малебна прысутныя чыталі вершы Ларысы Геніюш і свае, дзяліліся ўражаннямі.

Праліўны дождж не мог перашкодзіць правядзенню імпрэзы. Іншая справа — міліцыя. Яна доўга не прымусіла сябе чакаць. Некалькі міліцыянтаў, нягледзячы на тое, што бел-чырвона-белы сцяг над магілай памерлай паэткі гэта яе галоўнае жаданне і запавет, загадалі прыбраць сцягі. Пасля яны спісалі нумары ўсіх машын, на якіх людзі прыехалі ў Зэльву з розных гарадоў. Затрыманняў і арыштаў у гэты дзень не было. Трэба адзначыць, што традыцыйная штогадовая зэльвенская імпрэза па ўшанаванню памяці Ларысы Геніюш, гэта адзіная імпрэза такога роду на Гродзеншчыне, дзе яшчэ ні разу не затрымлівалі і не каралі яе ўдзельнікаў. Хоць супрацоўнікі міліцыі ўмешваюцца ў яе правядзенне і пагражаюць карамі.

Але людзі, як прыязджалі на магілу змагаркі, так і будуць ездзіць. Як гаворыцца — святое месца пустым не бывае. Цяжка сказаць, якую „работу" цяпер робяць тыя КДБэшнікі, якія былі пастаўленыя віжаваць за сваёй знакамітай суайчыннікай. Але з упэўненасцю можна сцвярджаць, што яна, нават мёртвая — іх перамагла. Бо нават сёння Ларысе Геніюш пастаўлены помнік на тэрыторыі зэльвенскай царквы як сведчанне таго, што праўда заўсёды перамагае. А самая вялікая дачка беларускага народа спадарыня Ларыса Геніюш заўсёды будзе жыць у сэрцах нашчадкаў і зараз ёсць гарантам таго, што беларускасць расквітнее, а над краінай назаўсёды залунае любы беларускаму сэрцу бел-чырвона-белы сцяг. Бо сённяшнія патрыёты прагнуць ісці той дарогай да свае любае айчыны Беларусі, якую паказалі знакамітыя змагары за святыя беларускія ідэалы. Тыя змагары, сярод прозвішчаў якіх залатымі літарамі выбіта імя Ларысы Геніюш.

Віктар ЛАДЗІЧ

Вачыма еўрапейца

Быць або не быць

У час урачыстасцей, увекавечваючых гадавіну паўстання ў беластоцкім гета сустрэў я адну польку, саратніцу Арміі

Краёвай, якую, дарэчы, бачу таксама амаль на ўсіх патрыятычных святах у Беластоку. У гэты раз я стаў каля яе перад помнікам пры вуліцы Жабяй. Нашэптвала знаёмай:

— Калі мы не будзем аб іх памятаць і шанаваць, то і яны не будуць.

Гэтыя словы прагучалі неяк красамоўна. Не толькі таму, што мы стаялі на месцы наканаванага ад пачатку пройгрышам паўстанцкага зрыву, быццам Варшаўскае паўстанне. Таксама таму, што словы полькі-ветэранкі аднолькава добра маглі б тычыцца апошніх падзей, напружанняў у адносінах да мясцовай меншасці — беларускай, праваслаўнай. Ва ўсіх галоўным чынам „героямі" былі дзеячы кіруючага Права і Справядлівасці, якія выводзяцца з Падляшша: віцэ-міністр унутраных спраў Яраслаў Зялінскі і тутэйшы ваявода Ян Дабжынскі. Першы расправіўся з БГКТ. Другі ў афіцыйным запрашэнні на адсвяткоўванне дня Польскага Войска — незалежна ад вызначэнняў з шэфам Ваяводскага вайсковага штаба — першы раз ад гадоў не запрасіў на праваслаўнае набажэнства з гэтай нагоды. Размясцілі затое на адваротцы запрашэння інфармацыю аб набажэнстве ў Гайнаўцы. Адно толькі, што яно не мела ваяводскага характару, як у саборы св. Мікалая ў Беластоку, але, падрыхтаванае праваслаўным ардынарыятам ПВ — мела агульнапольскі і апынулася ў адным радзе з інфармацыямі аб набажэнствах у беластоцкіх цэрквах баптыстаў, евангелістаў і мусульманскай мячэці. Кіраўнік Беластоцка-Гданьскай епархіі епіскап Іакаў з трывогай пісаў у адкрытым лісце: „Згаданае трактаванне грамадзян праваслаўнага веравызнання сведчыць аб курсе палітыкі якая вядзецца Вамі і яе дапушчанне цэнтральнымі ўладамі, што можа даваць сігнал аб абраным напрамку палітыкі Урада РП".

Я разумею епіскапа Іакава. Сігналы, якія высылаюць знатныя дзеячы ПіС родам з Падляшша ўжо неаднойчы маглі даваць зразумець праваслаўным, беларусам, каб памяталі, дзе іх месца, значыць, на абочыне грамадскага жыцця, пад дыктоўку палякаў, католікаў.

На шчасце, у народзе дух розуму не прападае, чаго прыкладам з'яўляецца тая полька-ветэранка АК з-пад помніка героям паўстання ў гета. Хоць праз хвіліну пасля яе прызнання я пачуў, як прыглядаючаяся ўрачыстасцям жыхарка вуліцы Жабяй сказала суседцы:

— То пані не ведаеш, што яны гэта тут заўжды робяць у дзень святога Роха.

Цяжка паверыць, каб 16 жніўня 1943 года кіраўнікі паўстання запланавалі ў гета яго выбух спецыяльна (і на злосць) якраз у дзень гэтага святога, заступніка жывёл, пілігрымаў, жабракоў і заражаных. Так ці інакш, у чарговую гадавіну гэтай падзеі ваяводы Дабжынскага пад помнікам не было. Урэшце ж таксама не было яго — незалежна ад запрашэння таксама ў адкрытым лісце епіскапа Іакава — на набажэнстве ў саборы святога Мікалая.

Пры нагодзе гадавіны паўстання ў гета варта згадаць, што ніхто з пасольства Ізраіля ў Варшаве, нават сам пасол, не атрымаў запрашэння ад арганізатара ўрачыстасці, значыць, беластоцкага, правага магістрату. Запэўніў нас аб гэтым дзень пасля свята яе прэс-інфарматар Міхал Собельман. Рассмяяўся толькі на заяву працаўніка аддзела прэзентацыі горада Гарадской управы Ежы Кофера, які ў лакальным дадатку да „Выбарчай газеты", гарантуючы, што запрашэнні былі высланы два тыдні загадзя, сцвердзіў:

— Я думаю, што яны не прыбылі з-за ліванска-ізраільскага канфлікта.

А, можа, з-за свята Роха?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Адраджаецца манастыр

На святкаваннях у гонар Супрасльскай іконы Божай Маці, якія 9 і 10 жніўня праходзілі ў Свята-Благавешчанскай лаўры, сабралася многа вернікаў з Беласточчыны і розных куткоў Польшчы. Прыбылі таксама паломнікі з Беларусі і Грэцыі. Людзі, якія доўга не наведвалі Супрасльскага манастыра, убачылі прыгожа адрамантаваныя цэрквы і іншыя манастырскія будынкі. Хаця ўнутры Благавешчанскай царквы трэба яшчэ класці тынкі, падлогу і выконваць канчатковае абсталяванне, то звонку захапляе яна сваёй прыгажосцю. Паломнікі, якія пяшком, на аўтобусах і сваіх машынах прыбылі пакланіцца іконе Божай Маці і прасіць Багародзіцу дапамогі ў жыццёвых выпрабаваннях і хваробах, пакідалі ахвяраванні, што можна будзе выкарыстаць дзеля далейшых будаўнічых і рамонтных работ. Людзі радаваліся, што ў манастыры заснаваным прыблізна 500 гадоў назад ізноў узмацняецца манаская малітва, а ў абіцель прыходзяць новыя энтузіясты манастырскага жыцця. Пасля цяжкіх выпрабаванняў, якія напаткалі манастыр ў міжваенны перыяд, пры савецкай уладзе і нямецкай акупацыі, а таксама за народнай улады, зараз ён пад наглядам архімандрыта Гаўрыіла адбудоўваецца, прыгажэе і ўзмацняецца духова.

Усяночную багаслужбу і апошнюю Святую Літургію ўзначальваў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава ў саслужэнні большасці епіскапаў нашай Царквы, гродзенскага епіскапа і вялікай колькасці святароў з розных мясцовасцей Польшчы. Хаця 10 жніўня быў рабочым днём, многа людзей рашылася звольніцца з працы, прыбыць на ўрачыстыя святкаванні і прылажыцца да цудоўнай іконы. Вядома, што і за апошні час многія асобы атрымалі дапамогу ад Багародзіцы пасля малітваў перад Супрасльскай іконай. У знак удзячнасці пакідалі яны побач іконы крыжыкі і іншыя дарагія ім прадметы, якія сведчаць аб цудадзейнасці іконы.

— Багародзіца не пакідае людзей, якія звяртаюцца да яе з просьбамі, — заявіў Бельскі епіскап Грыгорый у час пропаведзі да вернікаў. Гаварыў ён пра цяжкія выпрабаванні, з якімі трэба змагацца вернікам у сённяшні час і перасцерагаў перад спакуслівымі ідэямі і прапановамі, што ідуць да нас з Захаду і вучаць весці сябе нязгодна з Божым законам.

Многія вернікі рашыліся астацца на начныя малітвы, якія папярэдзілі раннія і самую ўрачыстую Літургію. Паломнікі маліліся перад вялікай Супрасльскай іконай Божай Маці, што знаходзіцца ў царкве св. Іаана Багаслова. Свяшчэннікі і вернікі сабраліся таксама на малітвы на катакомбах. Людзі звярталіся да Бога з памінальнымі малітвамі побач астанкаў манахаў, сярод якіх могуць знаходзіцца мошчы асоб, што заслужылі на святасць у час жыцця ў манастыры. Сабраныя радаваліся, што ізноў могуць маліцца на месцы, якое ў мінулым разам з манастырскімі будынкамі было забрана праваслаўным. У XVI стагоддзі, яшчэ перад падпарадкаваннем манастыра Уніяцкай царкве, побач абіцелі быў збудаваны Уваскрасенскі храм, а пад ім знаходзіліся катакомбы з 200 месцамі для пахавання. Хавалі там, апрача манахаў, багатых манастырскіх ахвяравальнікаў і іх сямейнікаў. Царква была знішчана ў першай палове XIX стагоддзя і пасля разабраная, а катакомбы былі прыкрытыя. Толькі ў васьмідзесятыя гады былі яны адкрытыя дзеля археалагічных доследаў і пакінутыя без належнага забеспячэння. Хаця зараз катакомбы з'яўляюцца ўласнасцю манастыра, могуць паявіцца цяжкасці з іх рэканструкцыяй і пабудовай зверху праваслаўнай царквы (як было запланавана раней), бо згоду на гэта трэба атрымаць ад захавальніка помнікаў архітэктуры.

Заснаванне і росквіт манастыра

— У турыстычных і іншых апрацоўках можна сустрэць інфармацыю, што манастыр заснавалі базыльяне. Бярэцца гэта з недаразумення, бо Базыльянскі ордэн заснаваны быў пасля Берасцейскай уніі (1596 год), — заяўляюць манахі з Супрасля.

Гэта Аляксандр Хадкевіч, Навагрудскі ваявода і маршалак Вялікага княства Літоўскага, які з'яўляўся прадстаўніком беларускага роду і Смаленскі епіскап Язэп Солтан, пазнейшы Кіеўскі мітрапаліт, былі фундатарамі Супрасльскага манастыра, які з Гарадка (заснаваны ў 1498 годзе) быў перанесены на сённяшняе месца. У 1501 годзе была пабудаваная драўляная царква ў гонар св. апостала Іаана Багаслова, а побач яе манастырскі будынак. Два гады пазней распачалася будова вялікай Благавешчанскай царквы, у якой можна было заўважыць візантыйскі і гатыцкі стылі. Яшчэ ў XVI стагоддзі Супрасльскі манастыр сталі называць Лаўрай і па знатнасці ў Вялікім княстве Літоўскім уступаў ён толькі Кіеўскай лаўры, становячыся выдатным інтэлектуальным асяродкам. Вялікае рэлігійнае і культурнае значэнне меў ён таксама ў пазнейшыя стагоддзі. З канца XVII стагоддзя пачала працаваць у манастыры друкарня, якая хутка разгарнула сваю дзейнасць. З яе выйшла каля 350 выданняў, у тым ліку 100 друкаваных кірыліцай, а што трэцяе было свецкага характару. Нядаўна адрадзілася манастырская друкарня, з якой выходзяць кнігі рэлігійнага і свецкага характару. У славутай Супрасльскай манастырскай бібліятэцы захоўваліся рэдкія рукапісы, а сярод іх Мінея Чэтная, напісаная на авечых шкурах, хутчэй за ўсё ў пачатку XI стагоддзя на Балканах. Раскінуты па розных бібліятэках свету для сённяшніх даследчыкаў лічыцца самай важнай крыніцай старацаркоўнаславянскай мовы.

Самы сумны час

Пра Супрасльскі манастыр гаворыцца многа, але пра сумны перыяд у яго дзейнасці, які распачаўся з міжваеннага перыяду і доўжыўся да дзевяностых гадоў, ведаюць нямногія. У 1919 годзе была закрыта польскімі ўладамі Благавешчанская царква, у 1922 годзе манастырскія будынкі былі перададзены Сельскагаспадарчай школе, а два гады пасля на загад ваяводы быў выкінуты з лаўры апошні манах. Не памаглі пратэсты праваслаўных вернікаў і хутка была закрыта царква св. Іаана Багаслова. Благавешчанскі храм сталі арэндаваць ад дзяржавы рымскія каталікі, а ў меншай царкве была адкрытая спартыўная зала. У 1939 годзе Чырвоная армія арганізавала ў Благавешчанскай царкве механічныя майстэрні і кузню, у печках якой спалены быў выдатны драўляны іканастас. У храме св. Іаана Багаслова дзейнічала тады кухня і сталовая. У час нямецкай акупацыі праваслаўным вернікам вярнулі меншую царкву, у якой сталі адбывацца багаслужбы. Вярнуліся ў Супрасль таксама некаторыя праваслаўныя манахі.

Благавешчанскую царкву разбурылі нямецкія войскі, адступаючы ў 1944 годзе. Манахаў выгналі ўжо прадстаўнікі польскай народнай улады ў 1945 годзе. У 1955 годзе выкінулі таксама праваслаўных з царквы св. Іаана Багаслова, якая была вернута праваслаўным прыхаджанам у 1958 годзе. Адбудова Благавешчанскай царквы распачалася ў 1984 годзе і тады таксама быў заснаваны Манаскі праваслаўны дом, які ў 1989 годзе быў пераменены на Благавешчанскі мужчынскі манастыр. У 1996 годзе Супрасльскі манастыр пераняў увесь манастырскі комплекс і тады распачалася яго адбудова.

Сённяшнія знатакі ў справах сакральнай архітэктуры звяртаюць увагу на цікавую манастырскую архітэктуру, на якой асталіся сляды з розных стагоддзяў і на арыгінальнасць Благавешчанскай царквы. Апошнім часам будаўнічыя работы ў царкве вяліся за ахвяраванні вернікаў з Польшчы і замежжа, а рамонты старадаўніх манастырскіх будынкаў праводзіліся з выдатнай дапамогай дзяржаўнага бюджэту. Хутка ўзнікае таксама мураваная агароджа, якая аддзеліць манастырскую тэрыторыю ад школы.

Цудадзейная ікона

Супрасльская ікона, што з'яўляецца копіяй Смаленскай іконы Божай Маці, трапіла на нашы землі хутка пасля заснавання манастыра. У 1503 годзе падарыў яе Смаленскі епіскап Язэп Солтан. Перад іконай малілася многа вернікаў і яшчэ ў XVI стагоддзі многа паломнікаў атрымала аздараўленне ад хвароб і іншую Божую дапамогу. Пасля маліліся перад іконай праваслаўныя і каталікі. Ікона была пазалочана, а ў час уніяцкага панавання была наложана рыза. Калі ў 1915 годзе вывезлі ікону ў Расію, яна прапала. Яе лёс невядомы па сённяшні дзень. У царкве св. Іаана Багаслова знаходзіцца яе копія выкананая ў XIX стагоддзі. Другая копія, яшчэ старэйшая, знаходзіцца ў Благавешчанскім храме.

Планы на будучыню

У кастрычніку прадбачваецца адкрыццё музея ікон, які будзе знаходзіцца ў левай частцы Палаца архімандрытаў. Будзе ён дзейнічаць як філіял Падляшскага музея. Побач музейных залаў будзе дзейнічаць кафэ і канферэнцыйная зала. З дапамогай мультымедыяльнай тэхнікі будуць прэзентавацца веды аб іконах, праваслаўных багаслужбах і сакральнай архітэктуры, а ўсё мае адбывацца на фоне царкоўнай музыкі. У музеі прадбачваецца таксама паказваць старыя кнігі, мастацкае рамяство і фатаграфіі аб праваслаўі. У далейшай будучыні плануецца таксама адкрыццё ў манастырскіх будынках Праваслаўнай акадэміі, у якой вяліся б канферэнцыі і сімпозіумы, гасцініцы і школы пісання ікон. Багатыя планы могуць рэалізавацца толькі з фінансавай падтрымкай з дзяржаўнага і іншых бюджэтаў ды падмогай вернікаў, якія актыўна адклікаюцца на манастырскія просьбы. Аднак самая галоўная задача манастыра, гэта малітва за людзей, якая доўжыцца ў Супраслі днём і ноччу. Калі будзе папаўняцца лік паслушнікаў і манахаў, манастыр адродзіцца.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Святары і паломнікі маліліся ў Благавешчанскай царкве і перад храмам

Небяспечная чыгунка

Мне тады было восем гадоў, наша сям'я жыла на сяле. Ранкам 24 снежня 1951 года разбудзіў мяне дзікі жаночы крык і плач з вуліцы. Гэта галасіла наша суседка Палашка, якая прыйшла са станцыі Вітава, дзе ейнага мужа Івана Хамічука зарэзаў поезд.

Як дайшло да таго нешчаслівага выпадку? Палашка з Іванам выбраліся ў госці на каталіцкую Каляду да іхняга найстарэйшага сына Андрэя, які з сям'ёй жыў недзе каля Ольштына. Каля чацвёртай гадзіны раніцы, а мо і яшчэ раней, пайшлі яны пяшком на станцыю каля Вітава. Тады поезд не спыняўся каля Пілі-пючкі, але крыху далей, на месцы, званым „Балотам"; у якасці чыгуначнага будынка стаяў там царскі яшчэ вагон. Калі яны зайшлі на прыпынак, было яшчэ цёмна і не відаць было не толькі поезда, але нават жывой душы. Іван прайшоўся па пуцях у кірунку Гайнаўкі і завярнуўся назад. У той час наехаў на яго поезд, на якім яны з жонкай мелі ехаць да сына. А поезд той ехаў без уключаных фараў і Іван яго не заўважыў.

Калі пакойнага прывезлі дадому (не помню: на возе ці на санях), другі яго сын Грыша прыйшоў прасіць у майго бацькі дапамагчы занесці пакойніка дахаты. Ён расказаў бацьку сон, які яму раніцай прысніўся: у сне ён, Грыша, параніў палец сваёй рукі, гэта яго моцна забалела і пацякла кроў.

Пасля, ужо ўдзень, я пайшоў наведаць свайго дзеда Дзмітрыя Шуля, які ўжо цяжка хворы ляжаў у пасцелі. Гавару дзеду:

— Хомку поезд зарэзаў.

— Няхай бы не лез пад яго, — адказаў дзед. Яму не ў галаве была чужая трагедыя, калі самога чакала блізкая смерць; я тады гэтага не разумеў, бо быў замалы.

Іван пакінуў удаву ды дарослых і недарослых дзяцей. Андрэй, да якога яны былі так трагічна выбраліся ў госці, ужо не жыве. І другі сын, Грыша, таксама не жыве; іншыя дзеці яшчэ жывуць.

Трох мужчын з Дубіч-Царкоўных загінула на чыгунцы з прычыны сваёй неасцярожнасці. Апрача згаданага Івана, майго сябра Паўла Корха, які працаваў на чыгунцы, забіў поезд у Чаромсе. Такі самы лёс спасціг і іншага чыгуначніка Мікалая Чыквіна. Як гаворыцца: калі б чалавек ведаў, што ўпадзе, то сеў бы. На жаль, не ведаем, што нас чакае.

Мікалай ПАНФІЛЮК

У самой вёсцы два трактары, самаходаў ніхто не мае. Аўтобус ПКСу заязджае ў Зубры тры разы ў суткі, а ў аўторак войт дае дадатковы транспарт, каб людзі маглі ў гмінны цэнтр даехаць...

Райская вёска

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Злезшы з аўтобуса ў ціхіх Зубках пытаю ўбачаную на адным з панадворкаў жынчыну, ці ў Зубры няма нейкай дарогі напрасткі, праз лес. А была такая, — кажа, але цяпер хіба ўжо яе няма ды і жанчына не раіць мне тудой хадзіць, бо на той дарозе можна спаткаць страшнага звера.

Ну то іду сабе жвіроўкай. За чыгуначным пераездам з левага боку адкрываецца прастора ні то сенажаці, ні то аблагу. З правага боку невялічкая сенажаць з нядаўна скошанай травой. Нідзе не відаць ні жывіны, ні чалавека. Толькі далей, у лесе, азываюцца хлапечыя крыкі, а далекавата з другога боку дарогі заўважаю жанчыну з вядзерцам. За лесам адкрываецца від геркаўскага жылога блока. Каля самога лесу сенажаці скошаны, але сена звалена ў капічкі або гніе ў пакосах. На бугарку стаіць утомлены засухай мікраавёс.

Каля жвіроўкі, што абыходзіць вёску ў бок калгасных будынкаў, байкаваты палетак бульбы. На ім завіхаюцца мужчына з жанчынай; падыходжу да мужчыны, які бліжэй дарогі. Не ўся бульба ягоная, у яго толькі ўчастак каля пятнаццаці сотак; гэта калгас дае сваім членам такія ўчасткі, якімі яны могуць карыстацца дзяля сваіх патрэб. Мой суразмоўца выбірае пустазелле, каб не глушыла бульбы; бульбу ён вырошчвае сабе і сямейнікам. Мае кватэру ў калгасным будынку, але сам жыве ў вёсцы.

Падаюся далей, у бок калгаснага комплексу. На полі побач пакосы залацістай саломы. Адзін жылы блок, трохпавярховы, з вялікіх пліт, два меншыя, пабудаваныя раней з будаўнічых брускоў, двухпавярховыя. Амаль палова акон без слядоў людскога пражывання. Ды і ў адміністрацыйным будынку „працуюць" толькі вокны на першым паверсе. На гаспадарчым пляцы адпачываюць каровы. Далей гара сасновага бярвення. Калі я ішоў у Зубры, ад вёскі ехаў вялікі грузавік поўны дылёвак. А калі я пакідаў вёску, заехаў акурат вялікі грузавік поўны сасновых калод. Значыць, калгас не толькі займаецца сельскагаспадарчай дзейнасцю, але і распілоўваннем драўніны.

Заходжу на вясковую вуліцу. Зуброўская вуліца здаецца быць свайго роду аазісам цішыні і спакою; пра гэта сведчыць як нішто густая расліннасць між бруку. Але вясковыя платы акуратныя, добра трымаюцца; большасць з балясаў, крыху з модных маляваных шырокіх дошак. Хаты тут драўляныя, у ціхім прысаддзі. У адным з панадворкаў крама, прадае маладзіца, у краме двух маладзёнаў папівае піўцо. Пытаю пра гаспадара вёскі; атрымліваю адказ, што жыве ён у хаце за каляровым плотам.

Далей з вуліцы чую гутарку праз плот дзвюх суседак, якія прызнаюцца сабе, што любяць паслухаць беларускіх перадач. Кіруюся на панадворак аднае з іх. Другая, пабачыўшы незнаёмага, хуценька рэціруецца ў сваю хату. Гаспадыня панадворка астаецца на лавачцы, побач яе дзве мыліцы. Новаму слухачу расказвае пра сваё дастатняе жыццё ў малодшы час, калі добры муж займаў высокую пасаду, не дазваляў ёй хадзіць на працу, толькі глядзець за домам, пабудаваным у Беластоку, у якім сем пакояў. І пра ўнучку, што штудзіруе ў Англіі, і пра ўнука, які вельмі беражна пра яе, старэнькую, дбае. Пра цяперашнюю вёску яна нямнога ведае, бо прыязджае сюды адно ў цёплы час.

А пра мінулае, — пасля паўтораць гэта і іншыя, — згадвае, што калісь навокал вёскі хадзілі тры вялікія статкі кароў. Брук у Зубрах паложаны вельмі даўно... Калі дзедка мае суразмоўніцы пакідаў вёску, яго яшчэ не было, а калі ўжо вярнуўся з Расіі, брук быў. Сама жанчына 1930 года нараджэння і я змеркаваў, што яе дзедка мог быць з 1880, маладым выехаў у Расію, адкуль вярнуўся разам з бежанцамі. Мабыць той брук і пакладзены нейкіх сто гадоў да нашага часу.

Колькі душ жыве пастаянна ў Зубрах, цяжка ў вёсцы даведацца. Бо летам жывуць там і тыя, што прыехалі з горада правесці на родных панадворках гэтую нявыгадную ў горадзе пару года; мо на двух-трох панадворках стаялі машыны з беластоцкай рэгістрацыяй. Мясцовыя жанчыны на пытанне, колькі іх астаецца на зіму, толькі паціскалі плячыма. Гаварылі, што жыве крыху бабылёў. Адна жанчына нават спытала мяне, ці і польскіх таксама трэба лічыць... Солтыса дома не было і ніхто не ведаў, куды ён падаўся, хаця бачылі яго з раніцы. Раней рэкамендавалі мне падацца да чалавека, які жыве далей ад вуліцы, у мураванцы; ён павінен усё ведаць...

Падаюся я ў паказаную мне хату. Але яе пажылы чалавек таксама не займаўся ўлікам сваіх аднавяскоўцаў. Ацэньвае, што ў вёсцы зімуе за дваццаць душ; адно старыя асталіся і некалькі „пры мацеры"; наймалодшаму, якім падаецца быць солтыс, каля сарака гадоў. У Зубрах двое коней, ніводнай каровы, адна каза. Нехта трымае крыху курэй, а свіней то мо ў блоках хто мае. Вядзецца адзін бусел; калісь было іх больш. Усе паздавалі зямлю дзяржаве або апісалі на дзяцей.

У Зубрах дзве крамы, адна калгасная, другая прыватная. У адну прывозяць хлеб тры разы ў тыдзень, а ў другую — два. І вяскоўцы ўсё ў гэтых крамах купляюць; да іх аўтакрамы нават не заязджаюць. Часам павесяць аб'явы, што шматы прывязуць прадаваць — і толькі.

У самой вёсцы два трактары, самаходаў ніхто не мае. Аўтобус ПКСу заязджае ў Зубры тры разы ў суткі, а ў аўторак войт дае дадатковы транспарт, каб людзі маглі ў гмінны цэнтр даехаць. А калі каму нездаровіцца, то дзеці з Беластока прыязджаюць і завозяць да лекара.

Калгас, хаця зямля тут няважная, абрабляе яе ўсю. Раней было калгаснікам тугавата, але калі атрымалі еўрадаплаты, стала лягчэй. Водаправод у вёсцы калгасны, пракладзены яшчэ ў шасцідзесятыя гады. Не ўсе завялі сабе ваду, нейкі час бралі з вулічнай студні. Але калі сталі нейкія прыязджаць і набіраць ваду ў бочкі, калгас тую студню закрыў.

Яшчэ каля дзесятка гадоў таму крыху за Зубрамі працавала школа. Цяпер былы школьны будынак у прыватных руках; туды прыязджаюць госці здалёк, а вяскоўцы і не ведаюць, што там адбываецца.

Дарэчы, сама вёска Зубры жыве сваім аўтаномным жыццём. Жвіроўкі яе абмінаюць, а вясковай вуліцай нават няма вельмі каму карыстацца. І на ёй з усіх бакоў зелень, як у раю; толькі з неба ўсміхаецца сонца. І лік жыхароў нават набліжаецца да райскага маштабу...

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Запрашэнне на Падляшша

Аж сто трыццаць чатырох студэнтаў, выключаных з беларускіх вучэльняў за апазіцыйную дзейнасць гатовы прыняць Універсітэт у Беластоку. Колькі з іх пакарыстаецца гэтай прапановай, яшчэ невядома. Згодна з Урадавай стыпендыяльнай праграмай імя Кастуся Каліноўскага, якую падпісалі вясной былы прэм'ер Польшчы Казімеж Марцінкевіч, лідэр беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч і прадстаўнікі Канферэнцыі польскіх рэктараў, у польскіх вышэйшых навучальных установах можа пачаць навучанне 300 непакорлівых маладых беларусаў. На працягу канікул аб'язджаюць яны польскія акадэмічныя цэнтры. У рамках летняй пабыўкі — апрача аб'езду краіны — маладыя беларусы ўдзельнічаюць у курсах польскай мовы. Іаанна Шварц, лектарка, супрацоўніца Калегіума Усходняй Еўропы Варшаўскага універсітэта, галоўнага каардынатара праграмы:

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

— Курсы польскай мовы мы сарганізавалі галоўным чынам у Вроцлаве, у Інстытуце польскай мовы і польскай культуры ды ў Кракаве на факультэце паланістыкі. Ставяць яны на разуменне на слых і агульна, камунікацыю. Студэнты вучацца таксама ў штодзённых сітуацыях, ездзіўшы па Польшчы. У апошні час зацікаўленне аднаго са студэнтаў выклікала слова „шчыпёрэк". У экскурсных аўтобусах слухаем песень па-польску і глядзім польскія фільмы.

У праваслаўнае сята Спаса больш за 160 маладых беларусаў — з 240, якія прысутныя цяпер у Польшчы — прыехалі ў Беласток. На тутэйшым Універсітэце сустрэліся з уладамі і самаўрадам вучэльні ды м.інш. з падляшскім ваяводам.

У размове „Нівай" прарэктар па дыдактычных справах УБ Міраслава Мелезіні пераконвала:

— Хочам заахвоціць беларускіх студэнтаў, каб выбралі наш Універсітэт, хоць бы з тае прычыны, што ён найбліжэй мяжы з Беларуссю. Не можам, аднак, ажыццявіць усяго, чаго яны чакаюць. Няма ў нас такіх напрамкаў як паліталогія ці лагістыка, аб якія некаторыя пыталі.

З сярод 134 рэзерваваных у беластоцкім універсітэце месцаў для беларусаў, м.інш. філалагічны факультэт можа прыняць 55 студэнтаў (на польскую, рускую і беларускую філалогіі), юрыдычны факультэт — 30, матэматычна-фізічны — 25, гістарычна-сацыялагічны — 10.

— Перад вамі вялікая місія, місія змены таго, што на першы погляд здаецца немагчымае да змены, — прыгадала гісторыю дзейнасці незалежнага студэнцкага руху ў Польшчы Іза Барташэўская, старшыня студэнцкага парламента, інфармуючы таксама аб дзейнасці Беларускага аб'яднання студэнтаў.

Адзначыла:

— Мы ганарымся вамі, гэтым, што вы ўжо зрабілі і што яшчэ зробіце ў будучыні.

І на заканчэнне ўсклікнула па-беларуску:

— Жыве Беларусь!

Алёна Андрэева, выкінутая з III курса журналістыкі мінскага універсітэта падаравала гаспадарам белчырвона-белыя паяскі-бранзалеткі з лозунгам „Вольная Беларусь".

Большасць прабываючых у Польшчы студэнтаў дэкларуе ахвоту вяртання пасля заканчэння навукі ў сваю краіну. Аднак усё паказвае на тое, што дыпломы атрыманыя ў Польшчы не будуць прызнавацца. Прафесар Мелезіні мае, аднак, надзею:

— Я веру, што сітуацыя ў Беларусі ўстабілізуецца, зменіцца, а гэтая справа шляхам двухбаковых дамоў будзе афармлена і нашы дыпломы будуць у Беларусі прызнавацца так, як ва ўсім Еўрасаюзе.

Сітуацыю выключаных студэнтаў прабуе выкарыстаць для сваіх прапагандысцкіх мэт беларуская рэжымная прапаганда. На пачатку жніўня дзяржаўнае тэлебачанне заявіла, што прымаючая беларускую моладзь Польшча прапануе ім благія ўмовы. У праграме „У цэнтры ўвагі" інфармавалася, што замест 400 долараў стыпендысты атрымліваюць 150, не гарантуецца ім харчаванне, прызначаюцца неабсталяваныя пакоі ў знішчаных інтэрнатах. Аўтар праграмы Юры Папоў, які апынуўся быў, дарэчы, на спіску асоб нежаданых у Еўрасаюзе і ЗША, заявіў:

— Маладыя апазіцыянеры мусяць прасіць грошай у сваякоў у Беларусі, каб літаральна не галадаць.

— Розныя рэчы гаворацца ў Беларусі. Студэнты з Беларусі, якія актуальна ў нас навучаюцца, вельмі добра ацанілі ўзровень кватаравання, умовы пражывання, — запэўнівае спадарыня прарэктар.

Згодна са стыпендыяльнай праграмай, студэнты з Беларусі звольнены з аплат за навуку, месячная стыпендыя налічвае 1 240 злотых (каля 413 долараў), атрымліваюць аднаразовую падмогу на г.зв. дадатковыя кошты на старце — 400 зл. (каля 133 дол.):

— Студэнтам гарантуецца разнавідная дапамога, таксама псіхалагічнай натуры, падтрымка ў апрацоўцы рознага роду дастасавальных праграм, атрымліваюць слоўнікі, энцыклапедычныя выданні і асноўную літаратуру, патрэбную на канкрэтных напрамках, кніжкі, дарэчы, вельмі дарагія, — пералічвае прафесар Мелезіні.

Аляксандр, выкінуты з факультэта інфарматыкі мінскага універсітэта:

— У Варшаве мы жывём у адным з найлепшых інтэрнатаў. Можа, ён горшы толькі таму, што ў ім няма басейна. Не толькі не галадаем, але можам галівудзіць! За інтэрнат, харчаванне і г.д. плацім каля 900 злотых. Тое, што гаворыць Беларускае тэлебачанне, гэта брахня! Раней гаварылі, што на Кастрычніцкай плошчы сабраліся адны наркаманы, якія ў палаткі вабілі паненак. БТ гэта нішто іншае як прапагандысцкі рупар, які не можа быць крыніцай верагоднай інфармацыі.

Гісторыі маладых беларусаў, якія трапілі ў Польшчу, і іх ацэнка сітуацыі падобныя.

— Я прымаў удзел у падзеях на плошчы Кастуся Каліноўскага — Кастрычніцкай. Арыштавалі мяне на дзесяць дзён і зараз пасля выкінулі з вучэльні. У Польшчы далі мне шанц, які трапляецца адзін на мільён; магу працягваць навуку, да таго ў найлепшай вучэльні, якую сабе выберу! — расказваў пасля спаткання ва УБ Аляксандр.

Дадаў:

— Пакуль няма ў мяне шанцаў вяртання ў Беларусь. Супраць мяне ўсчатая крымінальная справа. Гэта, аднак, не значыць, што я ўвогуле не хачу вярнуцца.

Сяргей з універсітэта ў Баранавічах:

— Дзякуючы гэтай польскай праграме нашы калегі ў Беларусі адважней могуць у краіне выходзіць на вуліцу, не баючыся аж так, што іх выкінуць са школ.

Алёна:

— Маю сяброўку выкінулі з вучэльні за працу ў незалежнай газеце. У яе абарону я сабрала подпісы пад пратэстам да дэкана. Назаўтра на факультэце паявіліся супрацоўнікі КДБ. Правяралі таксама нашы асабістыя справы. Канчаткова траіх з нас не дапусцілі да экзаменаў, быццам мы былі да іх непадрыхтаваныя. Я, як сказаў дэкан, да некаторых экзаменаў мела быць „маральна непадрыхтаваная". Справа ў тым, што я карысталася беларускімі словамі. Пасля заканчэння навукі ў Польшчы хачу вярнуцца і працаваць згодна з нармальнымі, еўрапейскімі стандартамі журналістыкі.

У час афіцыйнай часткі ва УБ, упаўнамочаны п.с. нацыянальных і этнічных меншасцей дэпутат ПіС Раман Чэпэ заклікаў:

— Выкарыстайце гэты час поўнасцю. Сёння ў цане кампетэнтнасць і кваліфікацыі. Ваша роля — вучыцца, каб быць як найлепшым для Беларусі.

А ваявода Ян Дабжынскі:

— Хоць вы яшчэ людзі маладыя, не чужыя вам каштоўнасці, якія стаяць ля падстаў нашай цывілізацыі: праўда, справядлівасць, ушанаванне правоў чалавека, свабода. Я веру, што ваша адукацыя, якую будзеце тут працягваць, паможа вам нанова паверыць у гэтыя словы і рэалізаваць іх у далейшым жыцці. Веру таксама, што вашае прабыванне ў Польшчы спрычыніцца да дыялогу паміж нашымі народамі і да пераадольвання ўсіх непаразуменняў.

Раіна СТЭФАНЧУК

У Міхалоўскай гміне

Пасёлак Міхалова ўзнік у 1832 годзе, а ягоная назва выводзіцца ад заснавальніка мясцовай прамысловасці Севярына Міхалоўскага. Міхалова да першай сусветнай вайны было буйным цэнтрам тэкстыльнай прамысловасці, дзе ў сарака пяці прадпрыемствах працавала 720 асоб.

Міхалоўская гміна, плошчаю ў 409,2 кв. км. у плане ландшафтнай разнастайнасці цікавая памяркоўна. Тэрыторыя гміны амаль плоская, памяркоўна перасечаная, памяркоўна аблесеная. Найбольшым лясным комплексам з'яўляецца Кнышынская пушча, якая займае паўночна-заходнюю частку гміны. Найбольшую турыстычную цікавасць прадстаўляе Семяноўскі вадаём і яго атачэнне. Не менш цікавая і даліна ракі Нарвы ніжэй вадаёма і даліны меншых рэчак.

У межах гміны адзін прыродны запаведнік — возера Горбач на тарфяніку, і адзінаццаць помнікаў прыроды, у іх ліку адзін валун, адна алея і адна група дрэў. Абшырныя лугі і балоты на ўсход ад Міхалова, з якіх набірае ваду рака Супрасль, з'яўляюцца гняздоўем вадаплаўных і балотных птушак.

Вартымі ўвагі ў Міхалоўскай гміне будуць наступныя аб'екты:

— прасторавая планіроўка Ялоўкі (XVI ст.), Міхалова (XIX ст.) і іншых вёсак;

— шматлікія даўнія і цікавыя прыклады вясковага драўлянага будаўніцтва, асабліва ў Міхалове, Шымках, Залешанах і Тапалянах;

— маёнтак з паркам у Геранімове (XIX ст.);

— драўляныя цэрквы ў Тапалянах (XVIII ст.), Міхалове (1906-1910), Юшкавым Грудзе (1912) і Новай Волі: прыхадская (1906-1908) і могільнікавая (XVIII ст.);

— касцёл (1867) і руіны касцёла (1910-1915) у Ялоўцы;

— зямныя ўмацаванні Батарэі;

— крыж паўстанцаў 1863 года ў Падазеранскім лесе;

— рэгіянальная зала ў Шымках.

У Міхалоўскай гміне даволі добрая начлежная база: заезны дом у Міхалове і дванаццаць аграмурыстычных кватэр ад Сушчы да Ялоўкі. Гміну перасякаюць тры памечаныя пешыя маршруты:

— „зялёны" з Нараўкі праз Бандары і Міхалова да Станцыі Валілы;

— „жоўты", праз Міхалова, Тапаляны, Тыльвіцу;

— „Краем Кнышынскай пушчы" з Заязерцаў праз Саколе ў Гарадок.

„Чырвоны" веласіпедны маршрут вядзе з Каралёвага Моста праз Тапаляны і Міхалова ў Ялоўку, а „жоўты" з Ялоўкі ў Мастаўляны.

Распрацаваная таксама ўжо канцэпцыя далейшага развіцця турызму ў „Краіне зубра".

Міхал МІНЦЭВІЧ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 38 -

— Ну, вось, азваліся ўва мне бацькоўскія інстынкты, — Грак з чуласцю глядзеў на малога Мікітку, Шадаравага сынка. І хоць малы быў зусім не чорны, як бацька, а трохколерны, а нават і чатырохколерны — сам белы, у карычнева-жоўтыя з дадаткам чорнага латкі, тым больш спадабаўся ён Граку. Маленькае і бездапаможнае кашэчае немяўля — хто ж падумаў бы, што так расчуліць яно птушку? Тым больш, што, як ні гавары, тыя каты, як і іншыя львы ці тыгры — драпежнікі. Ды які драпежнічак з такога немаўлятка? Праўда, кіпцікі ды зубкі вострыя, ды мяккенькі ён, пухнаценькі, як з ваткі...

Ну, як яму даць „маляцька", якога малеча так прасіў спачатку ў свайго вусатага бацькі, а пасля ў крылатага суседа? Вядома, трэба было яго весці дадому. Афіцыйна папрасіць малака ў бабулі. Гэта ж не папіванне малака жыльцом хаты-сямейнікам, ні нават частунак хітрага суседа, што залез у хату „пасеймікаваць".

— Усё залежыць у жыцці ад першых крокаў, — абмяркоўваў справу Грак перад парогам, а каля яго сядзелі два каты — вялікі і маленькі. — Трэба ўвесці афіцыйна Мікіту дадому, і папрасіць малака. Ну, малы, давай, прасіся! Мрм.. кр-раў!

— Мяўўў! — загаласіў Шадар.

— Вяўў! — прапішчала малое.

Бабуля досыць хутка выхінулася з-за дзвярэй. Шадар шмыгануў убок, а Грак падарваўся ўверх.

— Ай ты, малюсенькі! — бабуля так схілілася над Мікіткам, што амаль не зваліліся ёй з носа акуляры. — Малачка, пэўна, хочаш! Ну, хадзі, налью табе малачка. Ты, пэўна, Мікітка будзеш! Трохколерны кот прыносіць у хату шчасце!

Узяла коціка на рукі і знікла за дзвярыма.

— Адкуль яна ведала, што ён Мікітка? — вырачыў свае жоўта-зялёныя вочы Шадар. — Здаецца, я ёй майго сына не прадстаўляў.

— Бабулі ўсё ведаюць! Яны — вядунні! — Грак ад радасці, што малы ўжо дома, аж падскочыў.

— А яна яго там... не пакрыўдзіць, майго сына? — занепакоіўся Шадар.

— Наша бабуля? Яна і яму бабуляй будзе!

Грак хітравата кінуў вокам на Шадара: „Ну, вось, Твой Мікітка ўжо наш!"

Міра ЛУКША

Малпа ў штоніках

Старая малпа злавала: усе дзеці як дзеці — скачуць па дрэвах, віснуць на ліянах, перадражніваюць усіх, каго толькі ні ўбачаць — а што ім болей рабіць, як не перадражніваць — на тое і малпы...

А гэты, меншанькі, — ну, невядома хто: стаіць на задніх лапах, абшчаперыўшы дрэўца, і трохі адстаўляе ўбок левую нагу, зусім як бацька, і гэтаксама выпірае наперад грудзі... Якія ўжо там у яго грудзі — адны костачкі — вунь як выпінаюцца! — а й ён тудысама: вядома, бацькава насенне!

Той хоць ежу прыносіць, хаця й дурны... Ну якая ж разумная малпа спыніцца сярод паляны і, задраўшы галаву ўгору, будзе да немачы ўзірацца ў сіняе бяздоннае неба?!

А ён ледзь не днямі стаіць гэтак, і нічым яго з месца не зрушыш, нават кіпцюрамі...

Праўда, аднойчы нечага дачакаўся — дні два таму... Якраз тады ў небе нешта загуло, заляскатала — ці то навальніца блізілася, ці то звяруга якая невядомая аб'явілася — за дрэвамі не было відаць...

Усе спалохаліся, пахаваліся, адно ён, бацька, стаяў, як слуп, на паляне і, хаця калені яго дрыжэлі, з месца не сыходзіў...

А потым над палянай зноў застракатала, ужо гучней, і тады над ёй мільганула нейкая дзіўная страказа, завісла нерухома ў паветры, павіляла хвастом і нечакана апусцілася на суседнюю паляну, побач з ракой, схаванай адсюль узгоркам і жывой палоскай лесу...

Ніхто з іхняй вялікай малпінай сям'і не асмеліўся пабегчы туды, хоць было і цікава, і толькі бацька, пераадольваючы страх, нячутна апусціўся на чатыры лапы і нячутна, нібы выпалёўваючы мыш, пракраўся праз лясок і пачаў сачыць...

Страказа сядзела на зямлі, не рухалася і выглядала цяпер значна большай, чым у небе — ростам амаль як слон, — толькі ногі былі тонкія, як у мураша... а тулава ў адным месцы было празрыстае, а побач — дзірка — наскрозь... І з гэтай дзіркі, як з жывата, скакалі на зямлю не маленькія стракозы — бо не было крылаў, — а нейкія дзіўныя, светлага аблічча... малпы! — зусім без поўсці... Толькі на тулавах ды лапах мелася нешта... нібыта і поўсць, але нейкая незразумелая — сіняя і блішчастая... З вады выскачылі ці што?! Але адкуль тая вада: рака за ўзгоркам — на другім канцы паляны...

Малпіны вочы палезлі на лоб, калі тыя, прылётныя малпы, пачалі рабіць нешта неверагоднае — скідаць з сябе тую блішчастую сінюю поўсць — вылузваліся з яе нібыта змеі, — але не скручваліся колцам, каб не пашкодзіць новую і яшчэ зусім трывалую скуру, а шпурлялі старую на траву... Скакалі, рагаталі, бавячыся зусім як малпяняты з іхняга статку... а потым, наскакаўшыся, гурмой падаліся за ўзгорак, да ракі...

Малпа агледзелася, прынюхалася — небяспекі ніякай няма! — і бачком-бачком — каб лепей было ўцякаць, — наблізілася да страказы, але яна была нейкая смярдзючая, цвёрдая і нясмачная, і тады малпа, паазіраўшыся, схапіла раптам тую сінюю блішчастую поўсць і кулём кінулася ў лясок...

Там, пад густымі шатамі дрэў, малпа пакамечыла трохі тую дзіўнаватую поўсць — ад яе патыхала потам, толькі чужым, — знайшла ў ёй нейкія дзіркі і, прыгадаўшы бачанае, усунула ў іх свае ногі... Атрымалася малпа, у якой былі дзве поўсці — свая і чужая...

Цяпер можна было вяртацца ў статак і запатрабаваць увагі...

Асмялеўшы, малпы пазналі ганарліўца і з лямантам садралі з яго дзіўнаватую сінюю поўсць — каму дастаўся шматок, каму болей, — а меншанькаму — ладны кавалак з дзіркай, у якую ўшчаміліся абедзве ягоныя нагі...

Прытрымліваючы здабытак адной лапай — каб не паквапіліся іншыя, — меншанькі абшчаперыў другой тоненькае дрэўца і, адставіўшы ўбок нагу — зусім як бацька, — задраў галаву ўгору і, як бацька, задуменна пазіраў у бяздоннае сіняе неба, час ад часу прытупваючы для пэўнасці адстаўленай убок нагой... Зусім як бацька... А што зробіш — парода гэткая...

Анатоль КІРВЕЛЬ,
Санкт-Пецярбург

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Вершы Віктара Шведа

КУПІ МНЕ КУБІКІ „ЛЁГА”

— Да забавы мне татка нічога
Не хочаш ніколі купляць.
Ды прашу хоць кубікі „Лёга”
Купі, розум каб развіваць.

— Не звар'яцеў я, сыночак,
Хоць мяне мучыць сям'я.
— А калі звар'яцець татка, хочаш,
Ці дачакаюся я?

НОВЫЯ БОТЫ

Боты купіў сыночак
І быццам ашчаджае.
Матуля ведаць хоча,
Чаму не абувае.

— Мушу чакаць нямнога
Я, дарагая мама.
Увесь тыдзень ціснуць могуць,
Сказаў мне пан у краме.

ДЗВЕ САРАКАНОЖКІ

Дзеці спаткалі
Малой дарожкай
Вандравалі
Дзве сраканожкі.

— Пры іх сустрэчы, —
Азваўся Янка, —
Будзе дарэчы
Замок „маланка”.

ШЧАРБАТАЯ ДАРОГА

У вёску на святы
Вёз дачушку тата.
Даўно ўжо іх чакае
Бабуля старая.

Дарога - брукаванка
Трасла як ліхаманка.
— Ты едзеш, — кажа Ната,
Дарогаю шчарбатай.

Камп'ютэр і Інтэрнэт

(3)

Напрыканцы другой сусветнай вайны амерыканскія вучоныя Джон Мочлі і Праспер Экерт вынайшлі машыну, якая працавала не на рэле, як „Марк-1” Эйкена, а на аснове электронных лямпаў. Сваю вынаходку, якая працавала ў тысячу разоў хутчэй за „Марк-1”, Мочлі і Экерт назвалі „ENIAC”. Аднак для таго каб задаць новую праграму „ENIAC” і належным чынам з'яднаць правады, патрабавалася некалькі гадзін і нават дзён.

Каб спрасціць працэс задання праграмы, Мочлі і Экерт узяліся канструяваць новую машыну, здатную захоўваць праграму ў сваёй памяці.

У 1945 годзе да іх працы далучыўся матэматык Джон фон Нэйман. Ён падрыхтаваў даклад пра гэтую машыну і разаслаў яго многім навукоўцам для азнаямлення. У хуткім часе даклад фон Нэймана набыў шырокую папулярнасць у свеце. У ім упершыню былі ясна сфармуляваны асноўныя прынцыпы функцыянавання універсальнай вылічальнай прылады — **камп'ютэра**.

У сваім знакамітым дакладзе фон Нэйман апісаў, як павінен быць зроблены камп'ютэр.

Па-першае, камп'ютэр павінен мець **арыфметычна-лагічную прыладу** — яна ажыццяўляе працэс выканання ўсіх каманд у пэўнай паслядоўнасці.

Па-другое, камп'ютэр павінен мець **прыладу кіравання** (сучасныя клавіятура і „мышка”) — яна накіроўвае праграму або на выкананне, або на захаванне.

Па-трэцяе, камп'ютэр павінен мець **прыладу запамінання** — гэта **памяць**, якая можа пашырацца, для захоўвання праграм і шматлікіх дадзеных. Памяць складаецца з пэўнай колькасці пранумераваных ячэек. У кожнай з іх знаходзяцца апрацаваныя дадзеныя або інструкцыі праграм.

І нарэшце, камп'ютэр павінен мець **знешнюю прыладу для ўводу ці выводу інфармацыі** — гэта сучасныя дыскеты або CD-дыскі, а таксама CD-ROM, праз які інфармацыя з дыска „запампоўваецца” ў памяць камп'ютэра або „выпампоўваецца” з яго.

(працяг будзе)

Ягор КОНЕЎ

Польска-беларуская крыжаванка № 35



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 31: Бук, якар, рамка, ліпа, боб, перапёлка, тон, гімн, смага, Анеля, анёл, справа. Бор, міс, лета, пірог, Панама, рап, на, ёга, маліна, кмен, кабан, лёс, рэбус.

Дзікі і людзі

У бок вялікага дома на падвойным падворку хуценька, апіраючыся на палачцы, павядзе мяне, не аглядаючыся, бубуля Надзя Тарасэвіч, а я за ёй подбежкам накіроўваюся на канец Случанкі. Я праз гэтую вёску найчасцей мільгом праязджала, а варта было б мне і раней заехаць сюды, бо тут мае хату Міра Лукша. А да яе часта тэлефануюць замест да мяне, і ўсе лапочуць па-нашаму, што выклікае яе гнеў: „Не розумем тэго ензыка!" Але ў гэты раз не да яе, пабачыць што такая за птушка з беларускай вёскі што не ўмее ціўкаць па-свойму. Іду следам Галкі Пятэльскай, якая прыехала ў госці з мужам да сваякоў. Да Пятра Рожкі і ягонай жонкі Міраславы. А ўсе іхныя госці — якраз не ў хаце за сталом, а... павіслі на высокім плоце. Гаспадары, іхны сын Дарак, пані Таіса з мужам Янушам, яе брат Яўген Лісоўскі родам з Радуліна, што прыехаў аж з-пад Лодзі. А бабулька Надзя ў чорным адзенні, што быццам чорны птах кульгаючы прыляцела да сваякоў, кожнага з іх выхоўвала, трымала пад сваімі крыламі. І маткай ім была, і цёцяй. Пакуль усе ўзіраюцца ў хваёвы лясок з падлескам, сухі нізам, раскапаны, і я караскаюся на паркан. А за плотам рохкаюць бурыя валасатыя свінні, незатоўстыя, жвавыя, а паміж імі — паласатыя парасяты. „Свінадзікі!" — адказвае на маё нямое пытанне гаспадар. „Да 300 кілаграмаў дарастаюць. Гадуем, бо любім! Маладняку 18 штук. Ядуць тое, што і свінні. Даркавы!" — дадае, бо цяпер тут гаспадар іх 37-гадовы сын, хоць і самі яны, Пятро і Мірка, нестарыя. — „Трэба даць шанц маладым на гаспадарках, хай робяць, свае ідэі ўводзяць!"

Аграмадны падворак застаўлены машынамі як нейкі машынны парк. І па падворку з падвойнай клуняй, і ў шопках, і на агароджаным полі пад бярэзінкай — трактары, веялкі, сеялкі, культыватары, плугі, капалкі, грабілкі, касілкі... Хоць я родам з вёскі і мае браты механізатары, здаецца мне, што магу толькі дадумацца да чаго служыць некаторае абсталяванне. Бо зямлю абрабляюць тут на два дамы. А падворка „пільнуюць" тры сабакі, сярод іх аграмадны пёс падобны да бернардынца, які любога злачынцу адной лапай звалі ў бы з ног; ашчэрваецца да мяне ў шырокай засліненай усмешцы і дазваляе мне рабіць што хачу і глядзець што хачу. „Прыняў цябе за сваю!" — смяецца Янка Пятэльскі, Галчын муж, мой сусед па блёку, абводзячы мяне па сваяковых уладаннях. Ён сюды толькі заязджае, пабыць крыху, набрацца сілы ад роднага. Бо ў блёку — чалавек як спутаны, хоць на нашым беластоцкім пасёлку, зялёным і досыць прасторным, людзі адчуваюць сябе досыць вольна. Амаль як у вёсцы — на лавачках рассядаюцца, гутараць. Так я пазнаёмілася была і з Пятэльскімі, родам са Случанкі, якія першыя прыйшлі братацца з новай суседкай. І тут я адчуваю, быццам не першы раз завітала. Нейкія яны ўсе знаёмыя...

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

У спадарства Пятра і Міраславы Рожкаў сабраліся госці

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Пятро Рожка і ягоныя гадунцы

Бо і знаёмыя. І кожны хоча нагаварыцца. Часам адзін праз аднаго гаворыць, перакрыквацца трэба за доўгім сталом. Знаёмыя — расказваю Яўгену Лісоўскаму пра „Ніву", якой ён раней з'яўляўся частым чытачом, пра тое, як нас у рэдакцыі наведаў летась Ягор Анатоль Хлябіч, на пачатку існавання нашага тыднёвіка вядомы і талевіты паэт, які ўсё спелае жыццё правёў у Вроцлаве, а ж гэта ён, валілаўскі хлопец — найлепшы Яўгенаў сябра быў, і часта праседжваў з ім у цёці Надзі ў Случанцы. Разам на забавы хадзілі. І ён далёка ад радзіны, ад свайго. Сэрца туды яго завяло. „Тата мой баяўся, як я ў свет збіраўся, казаў: „Сынок, ты там згінеш!" От, і не згінуў, але трэба сваю вартасць ведаць, трымацца мацней за іншых. Гісторыю сваю ведаць, разважаць аб ёй. Кніжкі чытаць. Разбірацца ў палітыцы, каб не ашукалі. Яўген інжынер. Прайшла купа лет — прамысловасць упала. Цяпер бедны ўвесь народ, ці там, ці тут. Нашы людзі, калі хацелі, мелі шанц адукацыю зрабіць, стаць на добрыя пасады". Сястра Яўгена Таіса Лісоўская — дырэктарка інтэрната ў Беластоку. Муж у яе паляк, але „свойскі". „Ведаеш майго сябра Януша Нічыпаровіча?" — „Ведаю, я з ім была на адной каталіцкай Куцці". Януш, бізнесовец, аддорваецца расповедам пра крушынянскага бацюшку, якога дзейнасцю захапляецца.

Жанчыны — Мірка, Галя, Таіса, Броня, Надзя — у той час займаюцца частункам. Гляджу на каўбаску...

— Як іх...

— Гадуем, бо любім, — кажа Дарак. — Сам я гадоўца, і паляўнічы. Мы дбаем і пра тое, каб жывіна дзікая аднаўлялася. Як забіваецца? Ну, што ж, забіваецца. То ж плакаць не будзеш. На тое і гадуецца. Усё інтэлігентнае. Усім нам паміраць пара... А вы, тату, што пра вунію гаворыце. Я ніц не кажу.

— У нашай вуніі лепш не будзе, — бубніць басам гаспадар Пятро, аж усе сціхаюць. — Лепэр пакрычаў, пакрычаў, і што? Цяпер і сам з імі. Лепш зоймемся сваімі свінскімі дзікамі. А калі хто цікавіцца, як гадаваць такіх прыгажуноў, што ў нас па ляску бегаюць, хай звоніць: 857 175 541, а жывём мы вось тут, у сваёй Случанцы, у хаце з нумарам 37.

Міра ЛУКША

Фэст над возерам

Пры прыгожай пагодзе 9 жніўня г.г. ля святліцы ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) адбыўся канцэрт запрошаных васьмі беларускіх мастацкіх калектываў: з Беластока, Нараўчанскай, Міхалоўскай ды Гайнаўскай гмін. У Семяноўцы ды тутэйшай акрузе людзі любяць песні і такія мерапрыемствы як фэст.

Фэст адкрыў і жыхароў Семяноўкі, гасцей ды ўсе вакальна-музычныя калектывы прывітаў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч. Ён таксама ўручыў узнагароды — кубкі пераможцам спартыўных спаборніцтваў, якія ў той дзень, толькі раней, адбыліся на пляцоўцы за святліцай. Зычыў усім сабраным прыемнага адпачынку і настрою.

Канцэрт вяла Кася Бяляўская — працаўніца нараўчанскага Гміннага асяродка культуры. Найперш на сцэну выйшаў, амалоджаны сёлета, калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова, музычным кіраўніком якога ўжо шмат гадоў з'яўляецца вядомы ў нас Мікалай Мяжэнны з Гродна. Пасля выступілі гурты „Бяседнікі" і „Лучына" з Беластока. Яны прыгожа спявалі, выклікаючы ў гледачоў захапленне. Звонкімі і зладжанымі галасамі вылучаліся спевакі „Лучыны". Заваявалі яны сэрцы гледачоў песнямі: „Два дубкі", „Вяне рута", „Тапаля" і „Чараўніца".

Затым пачулі гледачы найпрыгажэйшыя і найбольш мілагучныя галасы — такія меркаванні многіх асоб — Любы Гаўрылюк, Алы Каменскай і Уладзіміра Іванюка з Беластока. Іх спеў дасканалы, ён — вялікая асалода для душы і сэрца! Запамяталіся песні ў іх выкананні: „Па зялёным гаю", „Тонкая сасонка", „Не шукай ты мяне" або „Выйду на вуліцу", „Жураўлі". Нават толькі дзеля іх спеваў варта было ехаць у Семяноўку з адлеглай мясцовасці. А былі тут прыезджыя і з Беластока, і з Гайнаўкі. Песні згаданых выканаўцаў успрымаюцца з трапяткой душою: з радасцю, але і з сумам-трывогай. Яны ў змозе навесці любы настрой — перажыванне. Прыспешыць біцё сэрца, калі пачуе дзівосныя пералівы галасоў.

Кожны з запрошаных калектываў меў сваю адметную манеру выканання песенных твораў. Маладзёжны ансамбль з перавагай дзяўчат з Дубін спяваў рытмічныя і зладжаныя раздольныя і меладычныя песні. Фальклорны калектыў „Нараўчанкі" з Нараўкі ставіў народную абрадавую сцэнку „Каравайніцы". А, вядома, дзе каравай і чарка, там і спяваюць.

Прысутных радаваў беластоцкі дзявочы гурт „Каласкі", які працуе пад мастацкім кіраўніцтвам Алы Каменскай, ды добры мужчынскі гурт „Зорка" з Беластока, які таксама з кожным годам займае сабе папулярнасць.

Канцэрт доўжыўся да гадзіны 20.45. Закончыў яго сямейны калектыў „Сакрэт" з Міхалова, які праспяваў найбольш песень — сама менш дзесяць. Выступіў паспяхова і атрымаў заслужаныя апладысменты. І так у летнюю ночку песні плылі на хвалях Семяноўскага возера далёка, далёка. Жыхар Семяноўкі казаў, што чуваць іх тут жа за дзяржаўнай мяжой у Беларусі. Эстрадныя гурты заклікалі прысутных да танцаў пад гукі меладычных песень. Прапанавалі купіць касетныя запісы іх песень.

Фэст у Семяноўцы сёлета быў мнагалюдны. Ён сабраў форум лепшых самадзейных выканаўцаў. Гэтыя словы гучалі пад занавес народнага (у тым выпадку яшчэ і прыхадскога св. Панцеляймона) святкавання. Танцавальны вечар адбыўся пад гукі калектыву „Аксель" з Нарвы.

Мерапрыемства ладзілі нараўчанскія гмінныя ўлады, Гмінны асяродак культуры ды Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

(мох)

Паэт, які заўсёды жыў песняй

27 жніўня спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Сяргея Новіка-Пеюна

Напярэдадні юбілею беларускага паэта Сяргея Новіка-Пеюна дастаў я з паліц свайго хатняга архіва цэлую папку яго пісем, выразак з газет, паштовак, лістоў з вершамі. Яшчэ раз усё перачытаў, пераглядзеў, успомніў гэтага мужнага, цярплівага, таленавітага і сціплага чалавека. Лісты Сяргей Міхайлавіч пісаў вялікія, шчырыя, сур'ёзныя. У пісьмах заўсёды мяне называў па-бацьку і на „вы", а пры сустрэчах — на „ты" і проста па імені. На лістах абавязкова ставіў тры пячаткі: адна была з адваротным адрасам, на другой было напісана „Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн г. Мінск", а на трэцяй былі словы „Сяргей Новік-Пяюн". Вось некалькі радкоў з яго пісем: „25-га лістапада 1943 года па даносе правакатара мяне арыштавалі гестапаўцы і асудзілі на смерць за антыфашысцкую дзейнасць. Са слонімскага музея, дзе я працаваў і жыў, рабаўнікі пазабіралі ўсе мае рэчы і ў тым ліку маю мандаліну. Чакаючы смерці ў адзіночцы слонімскага астрогу, я стварыў песню «Мандаліначка» і «запісаў» яе ў памяці" (з пісьма ад 18 жніўня 1988 года); „Я некалькі разоў званіў у рэдакцыю тыднёвіка «Беларускае тэлебачанне і радыё», каб звярталіся да чытачоў па-беларуску «добры дзень», а не па-польску «дзень добры»! Па-беларуску спярша стаіць прыметнік, а пасля імя, а па-польску наадварот: спярша — імя, а пасля — прыметнік. А рэдакцыя, хоць абяцала выправіць памылку, працягвае далей яе друкаваць. Яшчэ пішуць «раніцой», хаця па-беларуску трэба «раніцай». Ужываюць польскае слова «мажліва» замест беларускага «магчыма», «па крайняй меры» замест беларускага слова «прынамсі». Шмат памылак робяць і тыя, што выкладаюць на філфаку, псуюць беларускую мову" (з пісьма ад 20 лістапада 1988 года).

Сяргей Новік-Пяюн з жонкаю Людмілай і сябрамі. Слонім, 1936 г. Фота друкуецца ўпершыню

Сябраваў я з Сяргеем Міхайлавічам шмат гадоў. Ён часта наведваў Слонім, дзе жыла яго сястра, заходзіў да мяне ў рэдакцыю раённай газеты, дзе я працаваў. А калі я бываў у Мінску — забягаў да яго ў маленькую аднапакаёўку па вуліцы Купрыянава. Пра што толькі ён мне не расказваў!.. Але найбольш любіў распавядаць пра Слонім, пра мастака Антона Карніцкага, 180 карцін якога вывезлі немцы ў Германію падчас другой сусветнай вайны, пра гісторыка і краязнаўца Язэпа Стаброўскага, пра генерала Яўгена Леашэню і пра іншых землякоў. Часта паэт згадваў пра сустрэчу з Янкам Купалам у Слоніме ў 1939 годзе, калі пясняр вяртаўся з Беластока з народнага сходу. Тады Сяргей Новік-Пяюн працаваў у Слоніме інспектарам павятовага аддзела народнай асветы. 12 лістапада 1939 года да яго ў аддзел народнай асветы зайшоў чалавек, павітаўся, а пасля спытаў, дзе жыве Гальяш Леўчык. Сяргей Новік-Пяюн адразу пазнаў у госцю Янку Купалу. Яны разам паехалі ў хатку да Гальяша Леўчыка, там пагутарылі, а пасля машына, на якой прыехаў Янка Купала, прывезла іх у цэнтр горада. На развітанне Янка Купала ў блакноце Сяргея Новіка-Пеюна напісаў пару слоў: „Міламу Сяргею Пеюну падчас сустрэчы ў Слоніме. Янка Купала. 14.11.1939 г.". Пра гэты выпадак Сяргей Міхайлавіч згадваў мне часта. Ён вельмі ганарыўся, што хоць раз у жыцці меў сустрэчу з песняром беларускага народа.

Яшчэ ў 1938 годзе ў Слоніме Сяргей Новік-Пяюн разам са сваёй жонкаю Людмілай пачалі выдаваць на польскай мове (на беларускай мове польскія ўлады не дазволілі) „Газету Слонімскую". Гэта быў тыднёвік і выходзіў ён да верасня 1939 года.

Аднойчы я прыехаў да Сяргея Новіка-Пеюна ў Мінск, а ён адчыняе дзверы ў лагернай фуфайцы з нумарам на плячах. „Гэта мой сталінскі касцюм", — сказаў Сяргей Міхайлавіч. А пасля сеў на табурэтку і ціха заспяваў свае славутыя „Зорачкі":

Дні праходзяць, дні адходзяць, дні лятуць,
Быццам рэк бурлівых хвалі ўдаль бягуць.
Трэці год як на выгнанні ў чужыне
Трэба мучыцца душой і сэрцам мне...

(зборнік „Заўсёды з песняй", Мінск 1984, с. 7)

З вачэй у паэта пакаціліся слёзы. Гэты выпадак памятаецца мне да сённяшніх дзён. Не верыцца, як змог выжыць Сяргей Новік-Пяюн у тых жыццёвых сітуацыях, у якіх ён бываў. Бо лёс яго не песціў. Пры Польшчы сядзеў у турме ў Баранавічах, у чэрвені 1941 года быў паранены, у 1943 годзе — арыштаваны слонімскім СД і асуджаны да пакарання смерцю. У турме захварэў тыфам Хворага паэта немцы кінулі ў канцлагер Калдычэва, дзе крыху раней загінула яго жонка. А цешча з дзвюма ягонымі дочкамі ўцякла ў Польшчу, пасля чаго дзяцей сваіх Сяргей Міхайлавіч больш ніколі ў жыцці не бачыў.

4 ліпеня 1944 года немцы вялі вязняў на расстрэл. Сярод усіх быў і беларускі паэт. У час расстрэлу яго паранілі. Прыкінуўся мёртвым, а пасля схаваўся ў бліжэйшым лесе. Так застаўся жыць. А калі 10 ліпеня 1944 года савецкія войскі вызвалілі Слонім, Сяргей Новік-Пяюн пачаў працаваць тут дырэктарам мясцовага краязнаўчага музея. Але і гэтае шчасце было нядоўгім. Вясною 1945 года без прад'яўлення яму ніякіх афіцыйных абвінавачанняў, паэт быў зноў арыштаваны органамі НКУС на 10 гадоў пазбаўлення волі. Этапам яго адправілі ў пасёлак Нэлькан у Якуцію:

Плывуць дні за днямі, як шэрыя хвалі.
Нам сніцца радзімага неба блакіт.
Пад сопкай мы многа сяброў пахавалі.
Тут снег нашай цёплай крывёю заліт.
Праз краты нам свецяць паўночныя зоры,
Бы шлюць прывітанне ад роднай зямлі.
Сярэбраны месяц схаваўся за горы,
І чорныя цені вакол заляглі...

(зборнік „Песні з-за кратаў", Мінск 1993, с. 128-129)

У Беларусь Сяргей Новік-Пяюн вярнуўся ажно ў 1959 годзе. За плячыма ўжо былі 53 пражытыя гады, але трэба было пачаць усё спачатку. Яго рэабілітавалі, а ў якасці „кампенсацыі" за гады, праведзеныя без віны ў турме, яму выдзелілі аднапакаёвую кватэру ў пяціпавярховым доме ў Мінску па вуліцы Купрыянава, 9 і датэрмінова прызначылі пенсію, залічыўшы год Калымы за два...

Сяргей Новік-Пяюн нарадзіўся ў вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна 27 жніўня 1906 года. Скончыў мясцовую рускую гімназію і беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні. У 1926 годзе ў роднай вёсцы стварыў беларускі народны хор, які існуе да сённяшніх дзён. Алег Лойка ва ўступным слове да зборніка вершаў паэта „Заўсёды з песняй" (Мінск 1984, с. 4) напісаў: „Душа юнака рвалася да песень, а песню глушылі". Але заглушыць не змаглі. Бо паэт Сяргей Новік-Пяюн пісаў, спяваў і жыў. Жыў словам, песняй, любоўю да Бацькаўшчыны. Друкавацца ён пачаў ажно ў 1924 годзе ў заходнебеларускіх выданнях „Сын беларуса", „Студэнцкая думка", „Маланка", „Сялянская ніва", „Шлях моладзі", „Беларуская крыніца", „Заранка" і іншых. З друку асобнымі кніжкамі пачалі выходзіць яго драматычныя і вершаваныя творы „Ёлка Дзеда Мароза" (Вільня 1927), „Пакой у наймы" (Вільня 1927), „Цудоўная ноч" (Вільня 1927), „Прадка пад крыжам" (Вільня 1939), „Заўсёды з песняй" (Мінск 1984), „Зорачкі ясныя" (Мінск 1986), „Песні з-за кратаў" (Мінск 1993). У сваіх паэтычных кнігах Сяргей Новік-Пяюн пісаў пра тое, што сам перажыў у астрогах, лагерах і ссылках. Паэтычныя радкі яго прасякнуты пяшчотай да Бацькаўшчыны, верай у заўтрашні дзень:

Быць можа ў халоднай памру Калыме,
Сям'ю не пабачыўшы ў роднай больш хаце,
Я веру, мяне, песняра, ўспамяне
Не раз Беларусь — мая Маці.
Але ў маім сэрцы наяве і ў сне
Надзея святая таёмна крадзецца:
Да роднае Бацькаўшчыны, усё-ткі мне
Вярнуцца яшчэ давядзецца!

(зборнік „Песні з-за кратаў", Мінск 1993, с. 114)

У 1966 годзе Сяргей Новік-Пяюн наладзіў цесныя літаратурныя сувязі з беларускім тыднёвікам „Ніва" ў Беластоку, якія працягваліся аж да самай смерці паэта (памёр у 1994 годзе). У студзені і ліпені гэтага года ён друкуе вершы для дзяцей „Дзед Мароз", „Вожык", „Верабейчыкі" і апавяданне „Цешка". Асабліва шмат паэтычных радкоў Сяргей Новік-Пяюн апублікаваў у „Ніве" у 1980-х гадах. Найперш гэта былі вершы пра родную прыроду, лясных і хатніх жывёл, а таксама ўспаміны пра гісторыка Язэпа Стаброўскага, паэта Гальяша Леўчыка і пра Ядвісю — гераіню Якуба Коласа, якая жыла ў Слоніме.

2006 год — гэта не толькі 100-годдзе з дня нараджэння Сяргея Новіка-Пеюна, але і 80-годдзе Лявонавіцкага народнага хору, які ён арганізаваў, і 85-годдзе яго літаратурнай творчасці. Таму памяць пра паэта ў народзе яшчэ жыве.

Сяргей ЧЫГРЫН

http://snowbarsk.autoklad.com

Асаблівая рыса выяўленчага мастацтва заключаецца ў тым, што сучаснасць далёка не заўсёды прызнае яго майстроў. Усеагульнае прызнанне прыходзіць пазней, часцяком, калі мастак адыходзіць у лепшы свет. Але, па шчырасці, такое стаўленне сучаснікаў да творчасці таленавітых людзей было больш характэрнае для часоў мінулых, калі пабачыць карціны мастакоў удавалася толькі невялікаму колу людзей. Цяпер жа, дзякуючы Інтэрнэту, знайсці свайго аматара кожнай карціне значна лягчэй. Ну а яе аўтару значна бліжэй да прызнання.

Пэўна з такіх акалічнасцяў вырашылі размясціць у сусветным павуцінні выявы сваіх твораў сучасныя беларускія мастакі. Каб паглядзець на іх карціны, скульптуры і фотаздымкі трэба ўсяго толькі набраць на сваім камп'ютэры адрас http://snowbarsk.autoklad.com .

Даны сайт, шчыра кажучы, мала інфарматыўны, але разам з тым, цалкам англійскамоўны. Гэта яшчэ раз пацвярджае меркаванне, што мастакі зарыентаваныя на сусветную грамадскасць у данясенні свайго бачання свету.

Што ж тычыцца галоўнай старонкі, то яна выкананая даволі проста. Назва Snowbarsk магчыма камусьці нешта гаворыць, але людзям паспалітым гэта трэба патлумачыць, аб чым распрацоўшчыкі сайту чамусьці не паклапаціліся. Пад гэтай назвай невялікае паясненне па-англійску — „Беларускае мастацтва". Ну а ніжэй ідуць менавіта творы мастакой з подпісамі імёнаў і прозвішчаў аўтараў. Калі „клікаць" на іх, то трапляеш на старонку ўжо канкрэтнага мастака. Тут інфармацыі трохі болей, бо акрамя невялікай галерэі твораў пэўнай асобы, даецца і яе кароценькі біяграфічны расповед.

Цэлы сайт падзяляецца на некалькі раздзелаў, выйсці на якія знаходзяцца ў ніжняй частцы выяўлення. Галоўная старонка гэта адначасова і рубрыка „Painting" („Жывапіс"). На ёй месцяцца, трэба меркаваць, найлепшыя творы дзесяці мастакоў.

Старонка „Drawing" („Малюнкі") ідзе наступнай і таксама змяшчае дзесяць выяў карцін наступных майстроў. У якім парадку размяшчаюцца малюнкі, засталося незразумелым.

Наступная рубрыка „Sculpture" („Скульптура"). Там першых выяўленняў крыху менш — усяго восем. Прадстаўленыя творы беларускіх скульптараў не могуць не зацікавіць нават далёкага ад выяўленчага мастацтва чалавека, бо ў адрозненні ад малюнкаў і жывапісу розныя дзіўнаватыя фігуркі знаходзяцца ў трохмерным вымярэнні, што надае ім нейкую жывасць.

Старонка „Photo" („Фота") дазваляе кожнаму завітаўшаму на яе інтэрнэтнаму вандроўніку ўбачыць навакольны свет вачыма фотамастака. Фотаздымкі збольшага чорна-белыя. Менавіта такія колеры перадачы імгнення адразу дазваляюць мастаку святла заяўляць сваімі здымкамі прэтэнзію на нейкую гістарычнасць у ягонай творчасці.

Цікавай ёсць і рубрыка „Other" („Іншае"). Тут намешана ўсяго самага рознага ва ўсіх відах творчасці выяўленчага мастацтва. І нейкія малюнкі, і не зусім зразумелыя скульптуры, лялькі, дзіўныя, невядома да чаго прызначаныя прадметы і гэтак далей. Карацей кажучы, поўны і вольны палёт думкі і фантазіі беларускіх мастакоў. Ну а аб тым, што іх не так ужо і мала, сведчыць апошняя рубрыка „Artists" („Мастакі"), дзе змешчаны поўны пералік асобаў, што выставілі свае творы на суд наведвальнікаў сайту Snowbarsk.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Шчаслівы Гётэборг

Такога ўдалага выступу беларускіх лёгкаатлетаў не было ніколі. Наша дружына на першынстве кантынента заняла трэцяе месца па вартасці медалёў і пятае па колькаснай класіфікацыі каштоўнага металу. Вось як выглядае мацнейшая дзесятка зборных Старога свету: Расія — 34 медалі, Іспанія і Вялікабрытанія — па 11, Нямеччына — 10, Беларусь — 9, Францыя — 8, Польшча — 7, Швецыя — 6, Партугалія і Чэхія — па 4. У нашых спартоўцаў, якія апярэдзілі ўсіх суседзяў, акрамя ўсходніх, 4 залатыя ўзнагароды, 3 сярэбраныя і 2 бронзавыя!

Чыста намінальна на топ-турнірах Беларусь была яшчэ вышэй 11 гадоў таму, калі на чэмпіянаце свету заняла па значнасці медалёў другое месца адразу пасля амерыканцаў. І было гэта менавіта ў... Гётэборгу. Так што гэты шведскі горад сапраўды надзвычай спрыяльны для беларусаў. Сёлетні ж поспех айчынных лёгкаатлетаў можна лічыць больш важкім у параўнанні з вынікам адзінаццацігадовай даўніны па прычыне і валавай колькасці і „дыяпазону" дасягненняў. Пра вынікі першай паловы „каралеўскага" еўрафоруму было расказана ў мінулым нумары. Наступныя дні парадавалі яшчэ больш.

Як чакалася, не выявілася роўных беларускім дзяўчатам з ядром. У сектары для штурхання яны па гаспадарску змагаліся за першынство. У выніку чэмпіёнкай кантынента стала Наталля Харанека з вынікам 19 м. 43 см. Толькі адзін сантыметр (!) саступіла ёй сярэбраная прызёрка Надзея Астапчук. Айчынныя рыцары молата таксама пацвердзілі сваё рэнамэ. Прычым, фаварытам на гэты раз лічыўся Вадзім Дзевятоўскі. У выніку ж ён стаў трэцім. А чэмпіёнскія лаўры прымераў Іван Ціхан з Гродзеншчыны, чарговы раз даказаўшы, што ён умее „выстраліць" у сама патрэбны момант. Паміж нашымі здолеў уклініцца толькі фінскі асілак.

Вельмі эфектную вікторыю здабыла Алеся Турава. Золата ў стыпльчэзе (бегу на 3 кіламетры з перашкодамі) яна выйграла, пакінуўшы далёка ззаду ўсіх суперніц і ўсталяваўшы новы рэкорд чэмпіянатаў Еўропы. Такім чынам на рахунку сясцёр Туравых чэмпіёнскі „дубль", нейкіх падобных дасягненняў нешта і не згадваецца. У заключны дзень парадавалі спрынтаркі — 3-е месца ў эстафеце 4 па 100 м і 2-е ў спаборы 4 па 400 м.

Колькі слоў яшчэ пра тых, хто застаўся за медальным „кадрам". Сама добрых слоў заслугоўвае дзесяціборац Аляксандр Пархоменка, які ў выніку стаў шостым. Цэлы час яго спартовыя вынікі ідуць угару. Здаецца з часу Эдуарда Хямяляйнена Беларусь не мела такога атлета ў сама цяжкім відзе лёгкаатлетычнай праграмы. Сілу духа выявіла Вольга Краўцова, якая стала пятай на адной з „небеларускіх" дыстанцый — пяцікіламетровага бегу.

Моцнае здзіўленне выклікаў фантастычны скачок расійскай дружыны. Прычым ільвіную долю медалёў заваявалі жанчыны (ажно 28, у мужчын толькі 6 і агульнае 4-е месца). Сённяшнія спартовыя вынікі грунтуюцца найперш на фармакалогіі, перманентна выбухаюць допінгавыя скандалы. Па ўсяму відаць, расійскія вучоныя вынайшлі нейкія новыя прэпараты (ёсць версія, што і з „малодшымі братамі" падзяліліся), але „трэці Рым" ніколі ні ў чым не знае меры. Допінг ужываюць усюды, але ў таталітарных краінах ён узведзены ў ранг спартовай дзяржаўнай палітыкі (яскравыя прыклады — Куба, СССР, Румынія, ГДР). Першы скандал ужо выбухнуў — каля гатэлю, дзе пражывала расійская каманда знайшлі цэлафанавы кулёк са шпрыцамі і іншымі допінгавымі „аксесуарамі"...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вандруем па Беларусі

Ваўкавыскі раён, як і іншыя рэгіёны Гродзеншчыны, багаты сваёй архітэктурнай спадчынай. Нават тое, што ацалела пасля віхураў рознага кшталту захопніцкіх войнаў, пасля руйнавання савецкай уладай храмаў і рабавання прыватных забудоў, уражвае падарожніка.

Асабліва цікавай падаецца гісторыя прыватных уладанняў сядзібнага тыпу. Нягледзячы на крайне занядбаны стан бальшыні з іх сёння, сучасны вандроўнік будзе захоплены ўяўнай колішняй веліччу. Найярчэйшай перлінай у гэтым сэнсе падаецца сядзіба ў ***Красках****. Належала яна спачатку Булгарынам, а ад сярэдзіны XIX ст. да 1939 года — роду Сегеней, якія да пачатковай драўлянай пабудовы дабудавалі ў 1905 годзе мураваны двухпавярховы палац. Увесь палацава-паркавы комплекс займае каля 6 гектараў. Яшчэ адна адметная сядзіба на беразе рэчкі Зяльвянкі стаіць у* ***Падароску****. Пабудаваная яна была ў канцы XVIII ст. найверагодней Канстанцінам Чачотам, альбо ранейшымі ўладальнікамі Грабоўскімі. Тэрыторыя колішняга маёнтка, апошнім уладальнікам якога перад прыходам саветаў быў Раман Бохвіц, акружаная мураванай агароджаю з цаглянаю брамай. Іншыя вядомыя сядзібы ваўкавыскай зямлі:* ***Тэалін*** *(сярэдзіна XIX ст.), колішняе валоданне графа Струцінскага;* ***Рэпля*** *(захаваўся часткова парк другой паловы XIII ст., закладзены ў маёнтку Патоцкіх);* ***Гнезна****. У* ***Хацькоўцах*** *была сядзіба Ельскіх; у* ***Росі*** *ў палацы Адама Браніцкага была калекцыя старажытных рэчаў; у* ***Косіне*** *ў XIX ст. — хатні музей з археалагічным зборам.*

Сядзіба ў Красках

Найцікавейшыя археалагічныя помнікі ў раёне — гэта комплексы ў ***Краснасельскім*** *і* ***Карпаўцах****, дзе былі старажытныя крэмнездабыўныя шахты, а таксама сам раённы цэнтр — у старажытным* ***Ваўкавыску****, жыхары якога адсвяткавалі тысячныя ўгодкі горада ў 2005 годзе, былі тры ўмацаваныя паселішчы (замкі): Шведская гара, Замчышча, Муравельня. Гэтыя месцы цяпер — археалагічныя помнікі. Да скарбаў Ваўкавышчыны можна залічыць і дзве жыватворныя крыніцы — у* ***Краснасельскім*** *і* ***Мінеўшчыне****.*

Велічным хараством вылучаюцца хрысціянскія храмы рэгіёна. Пералічым толькі мураваныя храмы, якія маюць асаблівую адметнасць. Гэта Вацлаваўскі касцёл у ***Ваўкавыску*** *(1846-1848),* ***Троіцкі*** *ў* ***Шылавічах*** *(1907-1914, пабудаваны замест драўлянага храма 1600 г.), касцёл Найсвяцейшага Імя Марыі ў* ***Вярэйках*** *(1848), Міхала Арханёла ў* ***Гнезне*** *(пабудаваны каля 1524 г. уладальнікамі мястэчка Янам і Альжбетай Шамятовічамі), Яна Хрышчэнніка ў* ***Воўпе*** *(1773, пабудаваны біскупам Янам Непамукам Касакоўскім на месцы касцёла XVI ст., захоўваецца драўляны алтар першай паловы XVII ст., фундатарам якога быў падканцлер Казімер Лявон Сапега, сын Льва Сапегі), Петрапаўлаўскі касцёл у* ***Ізабэліне*** *(1778, быў пабудаваны графам Грабоўскім як кальвінскі збор), касцёл Яна Хрышчэнніка ў* ***Мсцібаве*** *(1910-1919),* ***Троіцкі*** *ў* ***Росі*** *(1852-1856), захоўваецца цудатворны абраз XVII ст, які перанеслі з капліцы ў вёсцы Мачульна. Да пералiку варта дадаць сённяшнія праваслаўныя храмы: у* ***Росі*** *— Троіцкая царква (1912, захоўваецца абраз Маці Божая Адзігітрыя мяжы XVII-XVIII стст.), у* ***Кузьмічах*** *(паміж 1840-1850, раней была каталіцкаю капліцай), у* ***Воўпе*** *— Петрапаўлаўская царква (1859, узведзеная будаўнікам Вайчынскім), Міхайлаўская царква ў* ***Ізабэліне*** *(кан. XVIII ст.). У* ***Ваўкавыску*** *была драўляная Петрапаўлаўская царква (канец XII ст.), якая да канца XIX ст. заняпала. Зараз у горадзе ёсць Мікалаеўская царква (1874), нядаўна пабудаваны новы праваслаўны сабор.*

Тэкст і фота Уладзіміра ХІЛЬМАНОВІЧА

„Культура” ў культуры

Пакуль жывеш на сваёй зямлі, не ўяўляеш, як дорага і блізка табе ўсё, што існуе вакол цябе. Мы прызвычаіліся ганіць тое што ў нас ёсць і хваліць тое, чаго ў нас няма, але ёсць недзе там, у землях абетаваных. Як быццам усё так было, так ёсць і так павінна быць заўсёды і безумоўна...

Больш за два гады я жыву ў Польшчы. Вельмі сумую па роднай Беларусі, але, дзякуй Богу, няма праблем з тым, каб паехаць да бацькоў ці да знаёмых. Сціснула замоцна сэрца — у машыну і наперад.

Пра існаванне Музея і асяродка беларускай культуры я даведалася не так даўно, года яшчэ няма. Чуцьто і раней чула, але неяк не краналі мяне гэтыя чуткі, не да таго было, пакуль трохі не акліматызавалася. Пасля нехта сказаў, што там, у бібліятэцы, працуе грамадзянка Беларусі, „такая, як ты”. Такім чынам я і папала ў музей.

Цяжка нават апісаць, якой аддушынай стаў для мяне гэты асяродак. Не, мяне ніхто тут у Польшчы не абражаў, не крыўдзіў, але не давала спакою туга па Радзіме. Здавалася, хоць бы слова на роднай мове пачуць, хоць самой некалькі слоў сказаць... Нібы і мова тут мясцовая падобная да нашай, і людзі ў вёсцы такія ж самыя, але ўсё не тое... Спатканне з Наталляй, Томкам, пані Марысяй было сапраўды рашаючай падзеяй у маім тутэйшым жыцці. Гэта быў ужо зусім іншы свет, які адкрыў новы этап майго быцця. З усім пылам кінулася ў вір культурнага жыцця беларусаў (і не толькі) Гайнаўкі і наваколіц. Цікава было ўсё! Цікавымі людзьмі былі супрацоўнікі асяродка, заўзятымі, ініцыятыўнымі, з бурнай фантазіяй і неўтаймаваным замілаваннем да ўсяго беларускага... Цікавыя людзі прыходзілі і прыязджалі ў бібліятэку... Мерапрыемствы, выставы, фэсты, сустрэчы... Я бывала там амаль кожны дзень, ведала, што калі б не прыехала, заўсёды будзе чакаць нешта новае, незвычайнае.

Ня шмат патрабавалася часу, каб заўважыць, што не ўсё там так гладка і мірна, як здавалася напачатку. „Нядобра штосьці ў Дацкім каралеўстве”... Праблемы, праўда, былі зусім не Гамлетаўскія. Усё было больш прыземлена і празаічна. Якое б не планавалася мерапрыемства, які б не пачынаўся праект — усё нібы натыквалася на незразумелае для мяне тады супраціўленне. Першыя часы я сумнявалася: можа, гэта адзінкавы выпадак, можа, я што не так зразумела, можа, і праўда штосьці не так зроблена. Ведаеце, для чалавека, які не ведае ўсю паднаготную працоўнага калектыва, цяжка разабрацца ў тонкасцях адносін паміж супрацоўнікамі, якія цягнуцца ўжо доўгія гады і маюць свае прычыны і падставы. Не хацелася верыць, што ініцыятыву і творчы запал супрацоўнікаў можа „прытрымліваць” іх жа дырэктарат.

Не падумайце, што мне лёгка аб гэтым пісаць. Не хачу нікога абразіць. І не ў тым справа, што хачу дапамагчы сваім сябрам, хаця для таго сябры і існуюць, каб адно аднаму дапамагаць. Я доўга чакала, збірала па крупінах факты і здарэнні. Вельмі баялася неасцярожным словам ці дзеяннем пашкодзіць і без таго напружаным адносінам. Але ўчора пачула горкія словы: „Горш нам ужо ўсё роўна быць не можа”. А тут яшчэ артыкул у „Ніве” аб заснавальніку музея Кастусю Майсені. Як жа магло здарыцца, што справа, якая пачыналася з такім энтузіязмам, якая перамагла столькі перашкод і праблем, аказалася залежнай ад людзей, якія зусім не зацікаўлены ў яе росквіце. Я не буду кранаць праблем чыста прафесійных, лічу, што не маю права лезці не ў свае справы. Правяду Вас толькі па дарозе, якою прайшла сама, па дарозе старонняга наглядальніка (хоць і даволі блізкага) падзей, што адбыліся ў асяродку за астатні год.

Пачалі мы праводзіць сустрэчы зацікаўленых людзей, якія праходзілі па суботах у бібліятэцы. Беларусы ці палякі, мастакі ці рукадзельніцы, пісьменнікі ці проста зацікаўленыя — нікому не забаранялася прыходзіць. Паказвалі свае новыя работы, расказвалі аб сваім жыцці і планах на будучыню, чыталі творы беларускіх пісьменнікаў, пілі каву-гарбату, частаваліся самаробнымі пячэнькамі і пірагамі... Нават моладзь прыходзіла... Ідылія... Але не надоўга. Пасля трэцяй, хіба, сустрэчы аказалася, што мы не можам тут сустракацца, ніхто не мае права ўваходзіць у бібліятэку, а тым больш арганізоўваць пасядзелкі. Там шмат матэрыяльных каштоўнасцей, за якія бібліятэкар нясе адказнасць, і якія, не давядзі Бог, могуць знікнуць. Гэта было першае, як абухом у лоб, зусім для нас незразумелае распараджэнне паважанага (да таго часу) дырэктара. Не паслухаліся. Дакладней, не паслухалася Наталля Герасімюк, бібліятэкар і першы завадатар усіх спатканняў і мерапрыемстваў. На свой страх і рызыку яна прымала нас у бібліятэцы. Гэта нібы зышло ёй з рук. Якой цаной — ведае толькі яна.

Далей — больш. Супярэчлівыя распараджэнні сыпаліся адно за другім. Нічога не можна было зрабіць, каб не натыкнуцца на поўную ці частковую забарону спадара дырэктара. Здавалася, чым больш праходзіць мерапрыемстваў, чым больш рэалізавана праектаў, тым большую павагу — і вагу — у грамадстве здабывае асяродак, а з ім — зразумелая ж справа — і яго дырэктар. Навошта ж рубаць сучок, на якім так утульна прымасціўся?

Пасля было Свята льняной кашулі. І крыкі спадара дырэктара, накіраваныя ў бок пружанскіх гасцей, якія прывезлі калекцыі ўласнаручна зробленых убранняў: „Гэта не Наталля вас запрасіла! Гэта дзякуючы мне вы тут і паедзеце туды, куды я скажу!” Гэта аб незапланаваным выездзе ў Орлю, дзе спадар дырэктар хадзіў пеўнем, як ініцыятар і арганізатар Свята.

Пасля была прэзентацыя кнігі „Забытых таямніцаў чар”. Гэта ўжо і наогул была містэрыя-буф. Каб хто расказаў — не паверыла б. Аказалася, што тыраж кнігі ... арыштаваны... спадаром дырэктарам. З якой нагоды, дазнацца мы не змаглі. Пасля доўгіх абурэнняў (сабраліся ж тыя, хто рабіў кніжку і з такою нецярплівасцю чакаў яе выхаду), спрэчак і нават сварак „арышт” быў зняты, і кніжку мы атрымалі, да таго ж кожны распісаўся ў атрыманні. Але расказаць хачу нават не аб гэтым. Калі пані Марыя Балтрамюк, перакладчык і няўтомны ўдзельнік праекта, жанчына да таго ж значна старэйшая, устала і са слязьмі стала расказваць аб тым, колькі ўкладзена сіл у праект, пытацца ў дырэктара, чаму ён так зрабіў, той сядзеў разваліўшыся, амаль паўлежачы, закінуўшы нагу на нагу і рукі на спінкі суседніх крэслаў. Дырэктар асяродка беларускай КУЛЬТУРЫ сядзеў перад старэйшай, паважанай усімі жанчынай, якая ў гэты час звярталася да яго... Сэрца сціснуў боль. Калі гэта — эліта, цвет беларускага культурнага грамадства, то якімі ж павінны быць радавыя беларусы? Такое пытанне, напэўна, з'явілася б у старонняга наглядальніка гэтага фарса. Не паверыце, да тае пары стаіць у мяне ў вачах гэтая карціна.

Дарэчы, на той прэзентацыі я адважылася ўставіць слова супраць дырэктара, і цяпер з'яўляюся для яго персонай нон грата. Ён мяне не бачыць, не заўважае, не вітаецца. Нават калі я сама павітаюся першай. Можа, мы не згодны ў поглядах на працу і адносіны, але я ўсё ж жанчына! Ці спадар дырэктар не ведае, што такое элементарная ветлівасць, ці хоць бы звычайнае джэнтльменства?

Паўтараю, у гэтым артыкуле я старалася не кранацца пытанняў работы асяродка, хоць, паверце, ёсць аб чым парасказваць. Аб звышурочных, аб недаспаных ночах, аб нерватрэпках ад дырэктара, аб выгаварах за дрэнные паводзіны... Дзіцячы садок... Але я проста жанчына, якая хоча далучыць свае веды, сілы і магчымасці да вялікай, патрэбнай справы захавання і адраджэння культурных традыцый. І самай важнай і патрэбнай, найпершай традыцыяй я лічу ўзаемную ветлівасць і прыязнь.

Вельмі хацелася б, каб людзі, ад якіх залежыць лёс асяродка і ўсіх, хто з ім звязаны, не абмінулі яго сваёй увагай. Мне, беларусцы па паходжанні, нацыянальнасці, выхаванню і грамадзянстве, як і сотням іншых людзей, не толькі беларусаў, вельмі важна, каб асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы сапраўды заставаўся АСЯРОДКАМ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ.

Людміла КАРПЮК
Дубічы -Асочныя

Яшчэ аб музеі і яго будаўніку

Такога я даўно не бачыў, каб у Гайнаўцы ў адзін дзень з усіх кіёскаў раскупілі „Ніву”. Так было з 32 нумарам нашага штотыднёвіка, які ў чацвер, 3 жніўня, разышоўся вокамгненна. А гэта сталася таму, што ў ім быў змешчаны артыкул прафесара Сяргея Габрусевіча — загадчыка кафедры беларускай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, у якім аўтар шырока ўспомніў асобу Кастуся Майсені і музей беларускай культуры ў Гайнаўцы. Для мяне асабіста такія ўспаміны вельмі важныя, бо я сам ад нейкага часу збіраю матэрыялы і дакументы аб асобе Кастуся Майсені. Калі іх накопіцца адпаведная колькасць, пачнецца чарговы этап рэалізацыі плана, якога вынікам стане кніжка аб Кастусю Майсеню. Трэба нам памятаць, што ягонае жыццё ад самага пачатку было надзвычай складаным і што ён па гэтай прычыне ніколі не скардзіўся і не наракаў на свой лёс. Да любой справы ён ставіўся вельмі сур'ёзна, стрымваў дадзенае слова, шанаваў родную мову і культуру.

У Кастуся Майсені ў апошнія гады пагоршылася здароўе, стаў хварэць і неабходным было пакласці яго ў бальніцу на дагляднa-апякунскае аддзяленне. Тут вельмі добрая і чулая апека з боку лекараў, медсясцёр і ўсяго медыцынскага персаналу, які ўзначальвае Галіна Вішнеўская. А працуюць тут высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія сардэчна апякуюцца працягла хворымі пацыентамі і разумеюць іх праблемы.

Артыкул прафесара Сяргея Габрусевіча зачытваўся ў гайнаўскай бальніцы. Прачытала яго свайму мужу таксама Анастасія Майсеня. Слухаючы напісанае Кастусь Майсеня спыняў чытанне і гаварыў: „Так было, вось так было, такія былі ў мяне добрыя сябры-беларусы”. У спадарства Майсеняў з'яўляліся тады слёзы на вачах, панавала цішыня...

Кастуся Майсеню наведваюць у бальніцы многія ягоныя сябры. Амаль кожны дзень хтосьці заглядае да яго ў палату № 4 і пытае: „Як здароўе, Кастусь! Трымайся моцна, ты наш беларускі герой — будаўнік беларускага руху на Беласточчыне”. Кастусь Майсеня і ягоная жонка Анастасія рады кожнаму візіту. Аднак Анастасія Майсеня з жалем успамінае тых калег па працы, калі яе муж быў старшынёю ПЗГС у Гайнаўцы ці працаваў на іншых адказных пасадах на Гайнаўшчыне, якія забылі свайго паплечніка. А ён дапамагаў ім то закончыць вышэйшую адукацыю, то пабудаваць дом, то добраўпарадкаваць участак вакол яго. Ён лічыў, што ягоныя саратнікі застануцца вернымі сябрамі аж да смерці. Сёння яны яго забылі, не помняць пра тое, як ён уладкоўваў іх на лепшыя пасады, як здалёк перад ім здымалі шапкі. Цяпер гэтыя нягоднікі бяруць высокія пенсіі, жывуць у харомах, на дачы ездзяць на іншамарках і не ведаюць аб сваім багацці. Калі Кастусь Майсеня пару гадоў таму адзначаў 80-годдзе, некаторыя гайнаўскія „героі” гнуліся перад ім у дугу, прыпадносячы кветкі з гэтай нагоды, але ўжо тады было відаць, што робяць яны гэта без душы і сэрца.

Вельмі сорамна таксама, што начальства Гайнаўкі ні разу не наведала ў бальніцы хворага Кастуся Майсеню, не пацікавілася яго матэрыяльным становішчам, не запытала ў чым можна яму дапамагчы.

Віктар БУРА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2006 r. upływa 5 września 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2006 r. wynosi 28,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 49,00 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 70,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 72,80). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 84,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 93,80), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 109,20), Australia — 10,00 (kwart. — 140,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1000 egz.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Турботы

І турботы, і хваляванне —
Ёсць у сямейцы баляванне:
Дачку замуж выдаваць,
Гасцей зусюль пасклікаць.

Грыша, Міша ды Раман,
Прыходзьце да нас у госці,
Тут гарэлкі мы пап'ём,
Будуць бацькі хросны.

Замуж Ганну аддаем,
Хай будзе шчасліва,
Жаніхом дык будзе Ваня,
Жыць будуць яны міла.

На вяселлі ўсе гулялі
З пятніцы да ранку —
Так калісь ім зваражыла
Чорная цыганка.

Як закончылі вяселле,
Усе госці ад'язджалі,
Ганна з Ванем на развітанне
Усіх цалавалі.

Як раз'ехаліся госці,
Стала ціха ў хаце,
Ваня з Ганнай пачалі
У жмуркі гуляці.

Не прайшоў задоўгі час —
Бегай як у прыску:
Трэба Ванечку зараз
Рыхтаваць калыску.

За калыскай — зноў бяда:
Як спакойна спаці,
Трэба ж жонцы памагчы
Дзіцятка даглядаці!

Ты дзіцятка калышы,
Памяняй пялюшку...
Бо Ганульцы маладой
Забалелі ручкі.

Кепская нявестка

„Пайду, бацька, я ў поле,
Недалёка за бронкай
Там чакае ўжо мяне
Мая дзяўчына Бронка.

А калі ўжо ажанюся,
Буду Броняй звацi,
Яна будзе шанаваць Вас,
бацька і маці".

А калі сын ажаніўся
Ды стаў Броняй звацi,
Дык стала наводзіць
Парадкі ў хаце.

Цяпер сын ціха сядзіць
І голасу не мае,
Толькі Броня ўсё фурчыць
Ды ўсіх праклінае.

„Свёкар, ціха ты сядзі!
Ты маўчы, старая!
Я па-свойму тут раблю,
У руках усё маю!"

І сынок цяпер маўчыць,
Не можа ніц сказаці:
Стала Броня гаспадыняй
У цалюткай хаце.

Калі такую нявестку
Меці ў сваёй хаце,
Лепей у маладых гадах
Бацькам паміраці.

РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ

Фота Уладзіслава ЗАВАДСКАГА

Калісь так жалі...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Задрыпанец выбраўся з жонкай у музей. Калі ўсё аглянулі, гаворыць ёй:

— Страціў столькі часу! Я тут ужо калісь быў.

— Па чым так мяркуеш?

— Па вогнетушылцы.

* * *

Між суседкамі:

— Хтось у вас учора страшэнна ругаўся. Так нельга рабіць, бо дзеці здэмаралізуюцца!

— Выбачайце, суседачка. Выбіраліся мы ў касцёл і муж не мог знайсці малітоўніка.

* * *

Парка буркуе ў рамантычным настроі. Раптам яна пернула. Пачырванела:

— Выбачай, — звяртаецца да яго. — Спадзяюся, што гэта астанецца між намі...

— А я хацеў бы, каб гэта выветрала.

* * *

— Чаму бландзінкі рана не ядуць бананаў і апельсінаў?

— Бо гэта паўднёвыя плады.

* * *

Спажывец да афіцыянта ў рэстаране:

— Заглядайце да нас часцей або прынясіце большыя чаркі!

Адгаданка

У лесе

(нумерада)
Праз шапку кронаў б'е прамень
І не дае ўдзень спаць
8__ 16__ 5__ 2__.
Дапамагае яму
14__ 12__ 10__ 9__,
Івалгаў і сініц сваяк.

Прамень засеў ва ўдода
15__ 13__ 1__ 6__,
Што вечара чакае ў дубе,
І нанач 3__ 11__ 7__ 4__
ў кронах дрэў
Пад калыхальны лісця спеў.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 29 нумара

Авёс, адліў, анёл, асот, дзед, дзюдо, жывапіс, зяць, Ілья, іней, ківот, кій, люцэрна, перац, пыха, рух, рыс, сяўба, тыгр, Тыцыян, хурал, цюльпан, цюцька, штыль, Юта.

Рашэнне: **Толькі актыўныя людзі сваёй напорыстасцю штурхаюць жыццё наперад, але толькі дабрыня і цярплівасць пасіўных людзей дазваляюць гэты рух.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Анатолю Маўчуну** з Познані.

27.08 – 02.09

Баран (21.03. — 19.04.) Магчымыя канфлікты з атачэннем і беспаспяховасць у дзеяннях. Можаш цяпер шмат дасягнуць, ды за вельмі высокую цану. Вельмі прыемныя любоўныя сустрэчы. Магчымы эмацыянальны шантаж з боку сяброў (злуюцца, што маеш замала часу для іх!).

Бык (20.04. — 20.05.) Асцерагайся ашуканцаў і круцялёў. Можаш заінвеставаць у штосьці, на чым страціш шмат грошай. Найлепш у гэты час ідзі ў адпачынак. Зменлівасць настрояў. Цяжкаваты тыдзень для Быкоў з 2-11.05. — займіцеся сваім здароўем.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Лішак энергіі выкарыстай на грунтоўны рамонт ці хоць дробныя парадкі. Пасварышся са сваёй парай так, што аж будуць ляцець ашчэпкі. Новыя магчымасці заробку.

Рак (22.06. — 22.07.) Набіраеш ветру ў свае ветразі! З адвагай прыступіш да рэалізацыі сваіх намераў. Добры час на выезд за мяжу ці прызнанне ў каханні. Затое сварка з суседзямі можа вырасці ў сусветны скандал!

Леў (23.07. — 22.08.) Шматлікія сустрэчы з сябрамі, кантакты з даўно нябачанымі сваякамі. Схочаш зрабіць большыя пакупкі, дык возьмешся за працу; шмат для гэтага будзеш мець нагод.

Дзева (23.08. — 22.09.) Урэшце атрымаеш энергіі ўдосталь! Рушыш з капыта, без сумненняў. Вельмі прыемныя хвіліны з сябрамі; сарганізуй нейкую большую імпрэзу. Абавязкова правер сваю кроў, не глытай зашмат лякарстваў, еж здаровае.

Шалі (23.09. — 22.10.) Будзь абачлівы, каб не назвалі цябе лёгкадумным. Магчымыя фінансавыя клопаты, пустапарожняе правядзенне часу. Не афармляй сур'ёзных спраў. Добра выкарыстай апошнія дні канікул.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Не правакуй сітуацый, якія могуць для цябе блага кончыцца. Не дайся ўцягнуцца ў нейкія фінансавыя махінацыі. Не паддайся спакусе зарабіць вялікія грошы. Магчымыя немалыя фінансавыя праблемы. Тым больш, што будзе на табе вісець нейкі знаёмы, якому здасца, што стаіць над прорвай.

Стралец (22.11. — 21.12.) Усё ў цябе ідзе вельмі спраўна. Новыя магчымасці, можаш дастаць тое, чаго даўно чакаў. Можаш узяць крэдыт. Адчуеш, што табою апякуецца нейкая нябачная істота, верыш у яе, ці не, якая памагае табе ў крытычныя моманты.

Казярог (22.12. — 19.01.) Квадратура Плутона з Ліліт можа папсаваць табе шмат спраў; не паддавайся спакусам людзей, якіх мала ведаеш! Лавіна памылак, непаладак, агромны стрэс. На працы не бяры на сябе зашмат абавязкаў.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Наладзіш вельмі цікавыя знаёмствы, добра дагаворышся з людзьмі на працы. Але старайся на падпісваць важных дамоў, трымай язык за зубамі ў бізнесавых справах. Мусіш пасплачваць свае даўгі!

Рыбы (19.02. — 20.03.) Хай вядзе цябе твой уласны нос — маеш цяпер знакамітую інтуіцыю. Ды асцярожна плануй кожны крок. Думай! Можаш несвядома нарабіць памылак за памылкамі, — калі будзеш жыць чужым розумам. Не шкадуй сабе шакаладу — паправіць настрой і павялічыць інтэлектуальныя здольнасці.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960